153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36 3833.2.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 97 (5471)
АЎТОРАК
28
КРАСАВІКА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

У краінах капіталізма, у краінах фашызма мільёны рабочых і сялян асуджаны на голад, галечу і беспрацоўе. У СССР улада Советаў знішчыла беспрацоўе, адкрыла ўсім працоўным шырокі шлях да заможнага, культурнага, радаснага жыцця. Пролетарыі і сяляне ўсяго свету! Ідзіце па шляху рабочых і сялян Совецкага Саюза! Далоў фашызм! Далоў капіталізм! Няхай жыве совецкая ўлада ва ўсім свеце!

З першамайскіх лозунгаў ЦК ВКП(б)

НАПЕРАД, ТАВАРЫШЫ ТРАКТАРЫСТЫ ЗА СТАЛІНСКІ УРАДЖАЙ!

Пісьмо тав. Н. Ф. ГІКАЛО лепшым трактарыстам БССР

ТРАКТАРЫСТАМ СТАРОБІНСКАЙ, КАПЫЛЬСКАЙ, ДЗЯРЖЫНСКАЙ, СМАЛЯВІЦКАЙ, ЦЯЛУШСКАЙ, ХОЦІМСКАЙ, ЛЕПЕЛЬСКАЙ, ВЕТРЫНСКАЙ, ХОЙНІЦКАЙ, СІРОЦІНСКАЙ і іншых МТС.

Таварышы трактарысты, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б рад адзначыць, што стаханаўскі рух, метады стаханаўскай работы знайшлі ў вашых радах большэвіцкі водгук.

Мы ганарымся вашымі поспехамі, ганарымся бліскучымі дасягненнямі вашых таварышоў — трактарыстаў Аладка, Пятровіча, Петручэня, Кандраценя, Жур, Пракаповіча, Жылко, Нікіфарава і іншых, якія ўзнялі выпрацоўку на ворыве да 12—14 гектараў за змену і да 30—37 гектараў на сялёбе.

Упэўнены, што іх вопытам аўладаюць усе нашы трактарысты, і, не спыняючыся на гэтым дасягненні, дадуць яшчэ больш высокія паказальнікі з тым, каб 1.000 гектараў і больш на трактар у 1936 годзе, за што змагаюцца перадавікі, былі цалкам выкананы ўсімі трактарыстамі Беларусі.

Сталінскі ўраджай у значнай меры залежыць ад вашай работы, таварышы трактарысты.

Наперад-жа, таварышы, за высокую якасць, за тэмпы, якія забяспечваюць сталінскі ўраджай.

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП(б)Б
Н. ГІКАЛО.

УНУТРЫПАРТЫЙНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ —НЕПАХІСНЫ ЗАКОН ПАРТЫІ

Пытаннем унутрыпартыйнай дэмакратыі наша партыя заўсёды аддавала выключную ўвагу. «Толькі на аснове ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, — гаворыцца ў статуце нашай партыі, — можа быць разгорнута большэвіцкая самакрытыка і ўмацавана партыйная дысцыпліна, якая павінна быць свядомай, а не механічнай».

Унутрыпартыйная дэмакратыя азначае перш за ўсё шырокую сапраўдную выбарнасць партыйных органаў, перыядычную справаздачнасць партыйных органаў перад шырокімі масамі членаў партыі, шырокую большэвіцкую самакрытыку ўнутры партыйных арганізацый, чулыя і ўважлівыя адносіны да голасу радавога комуніста з боку кіруючых партыйных работнікаў. Такая пастаноўка работы забяспечвае палітычны рост комуністаў, уцягненне шырокіх мас членаў партыі ў актыўнае партыйнае жыццё, у вырашэнне пытанняў унутрыпартыйнай работы. Гэта лепшы сродак барацьбы з чужымі партыі ўплывамі, з абывательшчынай, мяшчанскай самаўпакоенасцю. Сапраўдная ўнутрыпартыйная дэмакратыя ёсць лепшы рычаг ва ўзнаўленні ўсёй сістэмы ўнутрыпартыйнай работы і на яе аснове павышэння вострай класавай пільнасці комуністаў, іх непрымірымасці да ворагаў партыі і рабочага класа.

Велізарнейшыя перамогі, дасягнутыя нашай краінай пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі на чале з геніяльнейшым правадыром і настаўнікам таварышам Сталіным, таржаство сацыялізма ў нашай краіне стварылі магчымасці для расшырэння совецкай дэмакратыі. Мы пераходзім ад сістэмы не зусім роўных выбараў да роўных, ад многаступенных да прамых, ад адкрытых да закрытых. Гэта сістэма новых выбараў, якая знаменуе сабою новы, вышэйшы этап совецкага дэмакратызма, грунтуецца на велізарнейшых перамогах сацыялістычнага будаўніцтва, на непахісным найвялікшым аўтарытэце совецкай улады сярод многамільённага насельніцтва нашай краіны, на неабмежаванай любві і давер'і совецкага народу да нашай партыі і яе правадыра таварыша Сталіна.

Але расшырэнне совецкай дэмакратыі ставіць выключна адказныя задачы перад партыйнымі арганізацыямі, якія павінны вучыць уменню карыстацца ёю, як важнейшым інструментам далучэння найшырэйшых мас насельніцтва да палітычнага жыцця краіны.

На практыцы ў нас яшчэ часта бывае так, што ў многіх партыйных арганізацыях многа гавораць аб унутрыпартыйнай дэмакратыі, выносяць доўгія пастановы і рэзалюцыі, а на самой справе не разумеюць сутнасці ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і груба парушаюць яе.

ЦО нашай партыі «Правда», матэрыял якой сёння перадрукоўваецца ў «Звяздзе», указвае на грубае парушэнне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў менскай партарганізацыі. Сакратары парткомаў мяняліся па 6—7 раз на працягу 1—2 год. Партыйныя арганізацыі не ведалі, чаму ўходзіць стары сакратар і не выбіралі новага. Яго нярэдка назначаў гарком. Такія факты ёсць не толькі ў менскай партарганізацыі.

«Звязда» нядаўна пісала аб такім абураючым парушэнні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў партарганізацыі барысаўскага завода «Комінтэрн». Партыйны камітэт быў выбран у 1934 годзе. Цяпер у складзе парткома з выбраных застаўся толькі адзін чалавек. Астатнія за гэты час ужо некалькі раз мяняліся, як мяняўся і сакратар парткома. Груба пры гэтым парушаўся статут партыі, папіраліся правы членаў партыі. Людзі ўводзіліся ў склад парткома рашэннем двух членаў парткома, без ведама партыйнай арганізацыі, па прынцыпу займаемай пасады. Барысаўскі райком партыі не мог не ведаць аб гэтых абураючых агіднасцях.

А фактаў парушэння выбарнасці партыйных органаў, фактаў каптацыі членаў парткома ўзамен выбыўшых без ведама партыйных арганізацый ёсць колькі хочаце і ў іншых арганізацыях КП(б)Б.

Узяць хоць-бы гомельскую або віцебскую партарганізацыю. Колькі засталося цяпер на рабоце сакратароў парткомаў, выбраных пры апошніх перавыбарах партыйных органаў? Іх — адзінкі. У большасці-ж партыйных арганізацый сакратары ўжо мяняліся, па некалькі раз. Як правіла, уходзячыя сакратары не лічылі патрэбным адчытацца за сваю работу перад партыйнай арганізацыяй, а горрайкомы не сачылі за гэтым, бо звыкліся з такім становішчам, не бачылі тут грубага парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Там, дзе парушаецца прынцып выбарнасці, там няма дзейснай большэвіцкай самакрытыкі, няма поўнакроўнага партыйнага жыцця, а значыць, па сутнасці, ніякай перабудовы партыйнай работы няма.

Шырокая справаздачнасць партыйных органаў перад партыйнымі арганізацыямі з'яўляецца важнейшым элементам унутрыпартыйнай дэмакратыі. Між тым сістэматычная справаздачнасць райкомаў партыі не ўведзена ў практыку работы. Наадварот, як правіла, райкомы не адчитваюцца за сваю работу ад канферэнцыі да канферэнцыі.

За апошні год сталі больш-менш рэгулярна праводзіць сходы партыйнага актыва, раённыя партыйныя сходы. Гэтыя сходы маюць выключна вялікае значэнне і звычайна праходзяць пры вялікай актыўнасці комуністаў. На іх выносяцца каштоўныя рашэнні. Але не зазёўды комуністы ведаюць, як іх прапановы выконваюцца. Можна прывесці рад фактаў, калі аб рашэннях, прынятых на сходах актыва, назаўтра-ж забываюць. Прыкладам гэтага можа служыць полацкі райком. Тут было прынята вельмі добрае, дзелавое рашэнне аб стварэнні рэзерву, але яно разам з намечаным спісам рэзерву было прышыта да справы, а рэзерву, жывых людзей, з якімі-б праводзілі практычную работу, не аказалася.

А колькі ў нас яшчэ фактаў, калі важнейшыя пытанні партыйнай работы, як вылучэнне і перакідванне кадраў і іншыя — у некаторых райкомах вырашаюцца адным сакратаром, або, у лепшым выпадку — апытаннем. Гэта спіраe ролю бюро райкома.

Нязмерна вырас ідэйны і палітычны ўзровень нашай партыі. Партыя цяпер, як ніколі, адзіная, маналітная, моцная. Яна карыстаецца найвялікшым аўтарытэтам, неабмежаванай любоўю шырокіх мас працоўных нашай краіны. Ва ўмовах шырокай унутрыпартыйнай дэмакратыі раступ і выхоўваюцца члены партыі, вырастаюць новыя кадры кіруючых партыйных работнікаў.

Чула прыслухоўвацца да людзей, да голасу нізавога работніка, радавога комуніста, захоўваць унутрыпартыйную дэмакратыю, дакладна выконваць статут партыі— гэтага патрабуе ад нас партыя і наш вялікі правадыр і настаўнік Сталін.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ

Учора была праведзена ўсебеларуская радыёпераклічка аб ходзе сяўбы.

У пераклічцы прымалі ўдзел сакратары ЦК КП(б)Б таварышы: Гікало і Валковіч і члены бюро ЦК КП(б)Б.

Падрабязная справаздача аб радыёпераклічцы будзе дана ў заўтрашнім нумары «Звязды».

МНОЖЫЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВІКОЎ

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СОЦСПАБОРНІЦТВУ БССР З КІЕЎСКАЙ І ЧЭРНІГАЎСКАЙ АБЛАСЦЯМІ

ад 27 красавіка 1936 года

Рэспубліканская камісія адзначае, што побач з перадавымі раёнамі па сяўбе, як Бабруйск, Капаткевічы, Лепель, Чашнікі, дзе социялістычнае спаборніцтва сапраўды разгарнулася шырока ў масах, цэлы рад раёнаў усё яшчэ рескачваецца, практычна не арганізаваўшы спаборніцтва і не разгортваючы стаханаўскага руху ў масах трактарыстаў і палеводчых брыгад. Толькі гэтым у асноўным тлумачыцца той факт, што, напрыклад, Рагачоўскі, Жлобінскі, Асіпавіцкі раёны, якія нічым па сутнасці не адрозніваюцца ад Бабруйска, цягнуцца ў хвосце, выканаўшы 15—20 проц. плана, у той час як Бабруйск пасеяў 69 проц. Тое-ж можна сказаць і аб Слуцкім, Капыльскім, Лоеўскім, адстаючых ад Лепеля, Ушач, Чашнікаў. Тут хоць і ёсць якая-небудзь розніца, але якраз не ў карысць Слуцка і іншых.

Камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Чырвоны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па групе зернавых і бульбяных раёнаў перадаць БАБРУЙСКАМУ раёну, як перадавому раёну па сяўбе ранніх зернавых і ільну.

Занесці Бабруйскі раён на чырвоную дошку (сакратар РК т. ЧАРНЫШОЎ, старшыня РВК т. ЦАРОНАК).

2. Чырвоны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па групе ільнаводчых раёнаў перадаць Чашніцкаму раёну і занесці яго на чырвоную дошку, як раён, які падыходзіць да выканання плана сяўбы ільну і мае добрыя паказальнікі па сяўбе ранніх зернавых.

3. Занесці на чырвоную дошку за добрыя паказальнікі па сяўбе ранніх зернавых і ільну КАПАТКЕВІЦКІ раён (сакратар РК т. СТРОНГІН, старшыня РВК т. АРАПУТЧЫК); ТУРАЎСКІ раён (сакратар РК т. ДАМБРОЎСКІ, старшыня РВК т. ШАРШНЁЎ); СТАРОБІНСКІ раён (сакратар РК т. БАЯРЧАНКА); ЛЕПЕЛЬСКІ (сакратар РК т. ПАЦЕНГЕЛЬ) і УШАЦКІ раён (сакратар РК КП(б)Б т. ТАРАСЕВІЧ).

Звярнуць увагу кіраўніцтва Тураўскага раёна на падцягванне тэмпаў сяўбы ільну.

4. За ганебнае адставанне па сяўбе ранніх зернавых і ільну залічыць кандыдатамі на чорную дошку КРУГЛЯНСКІ раён (сакратар РК т. ЛІЎШЫЦ, старшыня РВК т. ГАРБУЗ); ГОРАЦКІ раён (сакратар РК т. СЕРАФІМАЎ, старшыня РВК тав. ЖУК); БАГУШЭЎСКІ раён (сакратар РК т. МЯЖУЕЎ, старшыня РВК тав. ЕЎДАСЕЎ); ШКЛОЎСКІ раён (сакратар РК т. ЕРМАКОЎ, старшыня РВК т. КОЗІНЦАЎ); КАСІЦОКОВІЦКІ раён (сакратар РК т. ЛІСКОВІЧ, старшыня РВК т. ГРЭБЕНЧЫК); МСЦІСЛАЎСКІ раён (сакратар РК тав. ШТЭЙНГАРТ, старшыня РВК тав. РАЙ).

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За добрыя паказальнікі па сяўбе ранніх зернавых і ільну камісія па спаборніцтву з Чэрнігаўскай і Кіеўскай абласцямі заносіць на чырвоную дошку наступныя раёны:

БАБРУЙСКІ раён (сакратар РК КП(б)Б тав. Чарнышоў, старшыня РВК тав. Царонак).

ЧАШНІЦКІ раён (сакратар РК КП(б)Б т. Марголін, старшыня РВК т. Трызна).

КАПАТКЕВІЦКІ раён (сакратар РК КП(б)Б тав. Стронгін, старшыня РВК тав. Арапутчык).

ТУРАЎСКІ раён (сакратар РК КП(б)Б тав. Дамброўскі, старшыня РВК тав. Шаршнёў).

СТАРОБІНСКІ раён (сакратар РК КП(б)Б тав. Баярчанка).

ЛЕПЕЛЬСКІ раён (сакратар РК КП(б)Б тав. Паценгель).

УШАЦКІ раён (сакратар РК КП(б)Б тав. Тарасевіч).

Новы ўсебеларускі рэкорд трактарыста Адзярыхі

СЛУЦАК. (ПА ТЭЛЕФОНУ). РЫХТУЮЧЫСЯ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА СТАХАНАЎСКАГА ДЭКАДНІКА, ТРАКТАРЫСТ СЛУЦКАЙ МТС ІМЯ КУЙБЫШЭВА, УДЗЕЛЬНІК УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ ПЕРАДАВІКОЎ УРАДЖАЙНАСЦІ ТАВ. АДЗЯРЫХА ТРАФІМ ДАВІЎСЯ НОВАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА РЭКОРДУ НА СЯЎБЕ ТРАКТАРНАЙ СЕЯЛКАЙ. 26 КРАСАВІКА, ПРАЦУЮЧЫ НА ТРАКТАРЫ «ХТЗ», ТАВ. АДЗЯРЫХА ЗАСЕЯЎ ЗА ЗМЕНУ 44 ГЕКТАРЫ АЎСА.

Я. КУЧАР.

ТРАКТАРЫСТ БАБРОЎ ПРЭМІРОВАН

МАЗЫР, 27 красавіка. (Па тэлефону). Трактарыст соўгаса «Слабодка» тав. Баброў Нікіта Паўлавіч, які 25 красавіка засеяў за змену 33,4 гектара, прэміраваны 250 рублямі.

Тав. Баброў абавязаўся яшчэ вышэй узняць прадукцыйнасць працы і не ўступіць нікому пяршынства ў спаборніцтве трактарыстаў у Мазырскай акрузе.

АФАНАСЕНКА,
дырэктар соўгаса.

ПЕРАДАВАЯ БРЫГАДА

БЯЛЫНІЧЫ. Спаборніцтва ахапіла ўсе трактарныя брыгады Бялыніцкай МТС. Шэсць брыгад змагаюцца за выпрацоўку 1.000 гектараў на трактар.

Перадавая комсамольская брыгада № 10 выпрацавала на 23 красавіка 204 гектары. Лепшы трактарыст Бадзелька Апанас выпрацоўвае ў змену па 8 гектараў замест нормы 3,5 гектара. Значна перавыконвае нормы трактарыст Зайцаў.

Трактарыст-комсамолец Цюльманкоў Парфен на трактары «ХТЗ» 24 красавіка выпрацаваў за сваю змену 9,5 гектара. Работа прызнана на «выдатна».

ЗАЛОГА,
намесніи дырэктара МТС па палітчасці.

ДА 12 МАЯ СКОНЧЫМ УСЕ ВЕСНАВЫЯ РАБОТЫ МТС

БЕШАНКОВІЧЫ. 25 красавіка на экстранай нарадзе брыгадзіраў трактарных брыгад Бешанковіцкай МТС абмеркавана пісьмо знатных трактарыстаў, агрэномаў і кіраўнікоў Капыльскай і Старобінскай МТС аб правядзенні стаханаўскага дэкадніка па завяршэнню веснавой сяўбы. 26 красавіка пісьмо абмеркавана ва ўсіх трактарных брыгадах.

Абмеркаваўшы пісьмо, трактарысты Бешанковіцкай МТС уключыліся ў падрыхтоўку да стаханаўскага дэкадніка і абавязаліся да 1 мая скончыць сяўбу ранніх зернавых, а да 12 мая завяршыць усю сяўбу і скончыць усе работы, прадугледжаныя вытворчым планам МТС на час сяўбы.

Трактарысты і ўвесь склад Бешанковіцкай МТС змагаюцца за тое, каб у рэзультаце праведзенага дэкадніка заваяваць пяршынства ў спаборніцтве машынна-трактарных станцый БССР.

ЛЕКСІН,
дырэктар МТС.

З'ЯВІЛІСЯ ПЕРШЫЯ ЎСХОДЫ ЯРАВЫХ

МАЗЫР, 26 красавіка. (Па тэлеграфу). Калгасы Мазырскай акругі перавыканалі план сяўбы ранніх зернавых. На 25 красавіка калгасамі акругі засеяна 41.000 гектараў зернавых, што складае 102,7 проц. плана. Заканчваецца сяўба ільну, разгортваецца пасадка бульбы.

Уся сяўба праведзена непараўнальна лепш, чым у мінулыя гады. У радзе калгасаў з'явіліся першыя дружныя ўсходы яравых. Віды на ўраджай азімых добрыя.

АНАНЬЕЎ, ДУБІНА, ПАТАПЕНКА.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ РАБОТНІКАМ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

МАСКВА, 27 красавіка. (БЕЛТА). Учора на пасяджэнні прэзідыума ЦВК СССР пад старшынствам Міхаіла Іванавіча Калініна былі ўручаны ордэны кіраўнікам і стаханаўцам чыгуначнага транспарту.

Доўгімі апладысментамі сустракаюць чыгуначнікі з'яўленне таварышоў М. І. Калініна і Л. М Кагановіча.

У поўных захаплення прамовах узнагароджаных гучаць падзяка партыі і ўраду, беззаветная любоў да таго, хто аддае выключную ўвагу чыгуначнаму транспарту, праяўляючы велізарныя клопаты аб кадрах, да любімага, мудрага правадыра працоўных Совецкага Саюза таварыша Сталіна.

Работнікі социялістычнага транспарту з пачуццём глыбокай удзячнасці гавораць аб сваім жалезным наркоме тав. Л. М. Кагановічу, пад большэвіцкім кіраўніцтвам якога дасягнуты велізарныя перамогі.

У сваіх выступленнях узнагароджаныя запэўняюць партыю і ўрад, што яны не спыняцца на гэтых перамогах, што яшчэ больш згуртуюць свой калектыў на барацьбу за скарыстанне рэзерваў на транспарце, за павелічэнне пагрузкі да 100.000 вагонаў у суткі, за ператварэнне чыгуначнага транспарту ва ўзорную, вядучую галіну народнай гаспадаркі.

З прамовамі выступілі: намеснікі наркома шляхоў зносін тт. А. М. Постнікаў, Н. Н. Зімін, Я. А. Ліфшыц, начальнік М.-Курскай чыгункі А. М. Амосаў, начальнік Томскай чыгункі А. Л. Ванян, слесар-аўтаматчык новасібірскага вагоннага ўчастка Томскай чыгункі К. Е. Баранцоў і іншыя.

Поўнымі захаплення авацыямі і крыкамі «ўра» было спаткана ўручэнне ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тав. Л. М. Кагановічу. У сваёй яркай прамове тав. Кагановіч гаварыў аб шляхах, якімі прышоў да перамогі социялістычны транспарт, і аб задачах, якія перад ім стаяць. Армія чыгуначнікаў, яе лепшыя людзі — крываносаўцы павінны праявіць яшчэ большую энергію і большавіцкую настойлівасць, каб з гонарам выканаць гэтыя новыя задачы, каб ператварыць транспарт Совецкага Саюза ў сталінскі транспарт.

Бура апладысментаў была адказам на палкі заклік жалезнага наркома апраўдаць высокую ўзнагароду партыі і ўрада.

Вышэйшыя ўзнагароды ўрада былі ўручаны 300 работнікам чыгуначнага транспарту.

Пасля ўручэння ордэнаў з прамовай выступіў тав. М. І. Калінін.

У канцы пасяджэння тт.: Калінін, Кагановіч, Уншліхт сфатаграфаваліся з узнагароджанымі.

К СОВЕЦКА-ЯПОНСКІМ ПЕРАГАВОРАМ АБ РЫБАЛОЎНАЙ КАНВЕНЦЫІ

26-га красавіка г. г. заг. II усходняга, аддзела НКЗС тав. Казлоўскі запрасіў да сябе советніка японскага пасольства п. Сако і паведаміў яму новыя совецкія прапановы па пытанню аб перагляде рыбалоўнай канвенцыі 1928 года, якія з'яўляюцца адказам на апошнія прапановы японскага ўрада і зводзяцца ў асноўным да наступнага:

Совецкі ўрад лічыць немагчымым прыняць японскую прапанову аб тым, каб усе ўчасткі, якія знаходзяцца ў японскіх падданых, былі пакінуты ў іх карыстанні на 12 год без правядзення таргоў, бо гэта патрабаванне несумяшчальна з совецкім заканадаўствам, якое прадугледжвае тэрмін арэнды здаваемых з таргоў марскіх рыбалоўных участкаў не звыш 5 год, і з'яўляецца неўгрунтаванай і непрымальнай для совецкага ўрада спробай істотна расшырыць існуючыя правы рыбалоўства, якімі да сучаснага моманту карысталіся японскія падданыя. Тав. Казлоўскі з усёй яснасцю ўказаў, што совецкі ўрад не можа згадзіцца на ўстанаўленне такога супярэчнага совецкаму суверэнітэту парадку, пры якім у парушэнне совецкіх законаў участак, атрыманы ў арэнду японскім падданым, становіцца як-бы яго ўласнасцю, і японскі падданы атрымлівае на гэты ўчастак нейкія асобыя правы звыш тых, якія ўстаноўлены законам і арэндным дагаворам.

Совецкі ўрад пацвярджае разам з тым сваю згоду прадоўжыць, у выключэнне з нармальнага спосабу здачы ўчасткаў у арэнду пры дапамозе таргоў, арэнду асноўнай масы арандуемых японцамі ўчасткаў, памянёных у пагадненні ад 13 жніўня 1932 г., на 5 год і выказвае сваю гатоўнасць за год да сканчэння ўказанага пяцігадовага тэрміну ўступіць у перагаворы з японскім урадам аб парадку далейшай арэнды азначаных участкаў.

Разам з тым, жадаючы ісці на сустрач пажаданню японскага ўрада, совецкі ўрад у парадку далейшай уступкі згаджаецца на тое, каб па сканчэнні тэрміну дзеяння канцэсійных дагавораў на кансервавыя заводы, з прымаванымі да іх рыбалоўнымі ўчасткамі, гэтыя дагаворы былі пераключаны на новы 10-гадовы тэрмін.

Совецкі ўрад згаджаецца таксама захаваць на 5 год асабліва ільготны і выгадны для японскіх рыбапрамыслоўцаў парадак уняцення ўсіх арэндных плацяжоў у аблігацыях пазыкі з захаваннем цяперашняга курсу.

Тав Казлоўскі ўказаў у заключэнне, што совецкі ўрад, ідучы на новыя ўступкі, якія сведчаць аб яго добрай волі і імкненні да хутчэйшага і спрыяючага завяршэнню перагавораў, звязвае гэтыя свае ўступкі са згодай японскага боку на ўсе яго прапановы і выказвае надзею, што японскі ўрад прыме ў сваю чаргу меры да таго, каб завяршыць перагаворы ў найкарацейшы тэрмін.

АБ ФАКТАХ ЦКАВАННЯ ОРДЭНАНОСЦА тав. КУЛАЯ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

АД 27 КРАСАВІКА 1936 г.

ЦК лічыць зусім недапушчальным той факт, што ў брагінскім райкоме партыі і РВК доўгі час быў невядомы факт цкавання ў калгасе «Чырвоны працаўнік» антысовецкімі элементамі ордэнаносца тав. Кулая.

Калі-ж, нарэшце, сам т. Кулай паведаміў аб гэтым РК, апошні, абмежаваўшыся пералачай справы міліцыі, зноў забыў аб т. Кулаю, не праверыў выканання свайго даручэння, у выніку справа не была ўзята на палітычную вышыню і змазана, а вінаватыя ў цкаванні засталіся непакаранымі. ЦК расцэньвае гэта, як праяўленне палітычнай блізарукасці з боку раённага кіраўніцтва (сакратар РК т. Гранькоў, старшыня РВК т. Баброў) і поўнай недаацэнкі з іх боку велізарнага значэння пастаяннай сувязі, кіраўніцтва і неабходнай дапамогі перадавым людзям калгаснага ладу, тым больш ордэнаносцам, якім з'яўляецца т. Кулай.

ЦК абавязвае тт. Гранькова і Баброва давесці гэты факт да ведама ўсёй партарганізацыі раёна і абгаварыць сваю непартыйную пазіцыю ў справе т. Кулая.

ЦК лічыць, што начальнік брагінскай раймілыцыі т. Сафонаў і пракурор т. Кенько праявілі сябе ў справе т. Кулая не як прадстаўнікі рэвалюцыйнай законнасці, а як бяздушныя чыноўнікі.

ЦК даручае галоўміліцыі — т. Клачкову і пракурору рэспублікі т. Кузьміну праверыць работу ўказаных таварышоў і, калі ў іх практыцы работы будуць выкрыты факты, аналагічныя данай справе, зняць іх з работы.

Прыняць да ведама заяву тав. Кузьміна, што ініцыятар цкавання т. Кулая брыгадзір трэцяй брыгады калгаса «Чырвоны працаўнік» Новік арыштаваны і аддан пад суд.

ДЫРЭКТАРАМ СОЎГАСАЎ

«ЗАРЭЧЧА», СМАЛЯВІЦКАГА РАЕНА — ГЛУШАНІНУ, «ГОРКІ-АБЧАК», МЕНСКАГА РАЕНА — т. ЦЕЦЕРУКУ

Праверкай на мясцах вашых соўгасаў па пытанню аб падрыхтаванасці і разгортванні работ па веснавой сяўбе ўстаноўлена, што пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб веснавой сяўбе і барацьбе за высокую ўраджайнасць вамі не выконваецца.

З першых-жа дзён палявых работ ворыва і падрыхтоўка глебы пад сяўбу праводзяцца нядобраякасна. У соўгасе «Заречча» на ўзараных 160 гектарах глебы пад сяўбу ёсць масавыя агрэхі, а мясцамі мелкае і няроўнае ворыва. А ў соўгасе «Горкі-Абчак» на плошчы больш 10 гектараў зроблена мелкае і з агрэхамі ворыва. Прыём і апэнка выкананых работ праводзіцца другараднымі работнікамі — учоткамі, а агрэномы і дырэктары соўгасаў работу ад брыгад не прымаюць, як гэта патрабуецца пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР, і таму ні адзін гектар дрэннага ворыва не забракаваны і налічэнне зарплаты рабочым зроблена як за добрую якасць працы.

Насенне для сяўбы ў соўгасах не падрыхтавана. У соўгасе «Горкі-Абчак» не ўсё насенне ёўса пратрыеравана, а віка мае толькі 36 проц. усхожасці пры норме не менш 90 проц. А ў соўгасе «Заречча» насенны ячмень у колькасці 60 цэнтнераў вельмі засмечан і непрыгодны для сяўбы.

Фармалін для пратручвання насення ў соўгасах адсутнічае. Насенныя ўчасткі ні ў адным соўгасе не выдзелены. Гаручае для трактараў не вывезена. У соўгасе «Заречча» з 137 цэнтнераў красавіцкага плана вывезена толькі 20 цэнтнераў, пры наяўнасці свабоднай тары на 50—60 цэнтнераў, а ў соўгасе «Горкі-Абчак» да выбаркі красавіцкага плана амаль не прыступілі і план выбаркі ў першым квартале выканан толькі на 41 проц.

З-за няправільнай арганізацыі работы і недастатковага кіраўніцтва з боку дырэктароў і агрэномаў участкаў у соўгасе «Заречча» былі перарасходы гаручага пры незыкананні нормы выпрацоўкі (на трактары «ХТЗ» за 8 гадзін працы ўзарана 1,2 гектара, выдаткавана газы 45 кілограмаў) і дрэнная якасці ворыва; а ў другім трактары выплаўлены падшыпнікі пасля адной гадзіны работы трактара. У соўгасе «Горкі-Абчак» заработак трактарыстам за выкананую работу з пачатку палявых работ яшчэ не налічваўся.

Усё гэта магло здарыцца толькі таму, што вы дрэнна падрыхтаваліся да сяўбы, што вы не зразумелі важнасці пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб дзяржаўным плане веснавой сяўбы», не мабілізавалі рабочых на ажыццяўленне практычных мерапрыемстваў па выкананню гэтай пастановы, не арганізавалі і не ўзначалілі стаханаўскі рух і не разгарнулі социялістычнае спаборніцтва, а фармальна, па-бюракратычнаму падышлі да выканання пастановы па веснавой сяўбе.

Таму прапануецца вам зараз-жа выправіць усе вышэйпаказаныя недахопы ў рабоце па веснавой сяўбе і мабілізаваць рабочых на высокую якасць работы і ў максімальна кароткія тэрміны скончыць сяўбу.

Аб прынятых вамі мерах паведамце да 3 мая гэтага года.

Упаўнаважаны КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР ШУСЦІН.

АБ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ЗВАННЯХ І ЗНАКАХ АДРОЗНЕННЯ АСАБІСТАГА СКЛАДУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МІЛІЦЫІ НКУС САЮЗА ССР

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанаўляюць:**

1. Устанавіць для рабоча-сялянскай міліцыі НКУС Саюза ССР наступныя спецыяльныя званні:

А. ДЛЯ НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ:

1. Сержант міліцыі
2. Малодшы лейтэнант міліцыі
3. Лейтэнант міліцыі
4. Старшы лейтэнант міліцыі
5. Капітан міліцыі
6. Маёр міліцыі
7. Старшы маёр міліцыі
8. Інспектар міліцыі
9. Дырэктар міліцыі
10. Галоўны дырэктар міліцыі.

Б. ДЛЯ РАДАВОГА І МАЛОДШАГА НАЧАЛЬНІЦКАГА СКЛАДУ:

1. Міліцыянер
2. Старшы міліцыянер
3. Аддзялённы камандзір
4. Помкамузвода, старшыня

2. Зацвердзіць прадстаўленыя Народным камісарыятам унутраных спраў Саюза ССР знакі адрознення для начальніцкага і радавога складу рабоча-сялянскай міліцыі НКУС Саюза ССР;

3. Даручыць Народнаму камісару ўнутраных спраў Саюза ССР:

а) прадставіць на зацвярджэнне СНК Саюза ССР палажэнне аб праходжанні службы начальніцкім складам рабоча-сялянскай міліцыі НКУС Саюза ССР;

б) правесці атэставанне начальніцкага складу рабоча-сялянскай міліцыі НКУС Саюза ССР і прысвоіць яму адпаведныя спецыяльныя званні.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

В. а. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
І. УНШЛІХТ.

26 красавіка 1936 г.
Масква, Крэмль.

Усесаюзная сельгасвыстаўка адкрыецца 6 ліпеня 1937 года

МАСКВА, 27 красавіка. (БЕЛТА). У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 17 лютага 1935 года «Аб арганізацыі ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве ў 1937 г.», Совет Народных Камісараў Саюза ССР разгледзеў і адобрыў прадстаўлены выставачным камітэтам праект генеральнага плана ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1937 г.

Праект прадугледжвае будаўніцтва выставачных павільёнаў агульнай кубатурай у 840 тыс. кубаметраў.

Адкрыццё ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі СНК СССР пастанавіў прыўрочыць да **6 ліпеня 1937 года** (да дня канстытуцыі СССР).

Надаючы вялікае значэнне паказу лепшых узораў работы перадавікоў социялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1937 г., СНК СССР абавязаў саюзнаркомы рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы, Наркамзем СССР і Наркомсоўгасаў неадкладна разгарнуць падрыхтоўку экспанатаў для сельскагаспадарчай выстаўкі.

АБ СКЛІКАННІ АКРУГОВЫХ З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ ПОЛАЦКАЙ, ЛЕПЕЛЬСКАЙ, СЛУЦКАЙ І МАЗЫРСКАЙ АКРУГ

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

1. Акруговыя з'езды советаў Полацкай, Лепельскай, Слуцкай і Мазырскай акруг склікаць пасля веснавой сяўбы ў 1936 годзе.

Прапанаваць оргкамітэтам ЦВК БССР азначаных акруг унесці канкрэтныя прапановы аб тэрмінах склікання з'ездаў советаў.

2. Устанавіць наступны парадак выбараў і нормы прадстаўніцтва на акруговы з'езд советаў:

1) выбары дэлегатаў праводзіць на пленумах гарадскіх і сельскіх советаў;

2) у гарадах выбіраць аднаго дэлегата ад 200 выбаршчыкаў, а ў сельскіх мясцовасцях — аднаго дэлегата ад тысячы жыхароў.

3. Рэкамендаваць оргкамітэтам унесці наступныя прапановы аб парадку дня акруговых з'ездаў советаў:

1) даклад оргкамітэта аб арганізацыі акругі і задачах гаспадарчага і культурнага ўмацавання раёнаў акругі;

2) выбары.

4. Устанавіць колькасны склад акруговых выканаўчых камітэтаў 40—45 членаў.

Склад прэзідыумаў акруговых выканаўчых камітэтаў устанавіць у колькасці 11 членаў.

5. Абавязкі акруговых выбарчых камісій па падрыхтоўцы і правядзенню акруговых з'ездаў советаў ускласці на адпаведныя оргкамітэты.

Зацвердзіць старшынямі выбарчых камісій наступных таварышоў:

а) па Полацкай акрузе — тав. Свірыдава Э. І.;

б) па Лепельскай акрузе—тав. Пушчына Ф. Ф.;

в) па Слуцкай акрузе — тав. Жолудава К. М.;

г) па Мазырскай акрузе — тав. Дубіну А. В.

6. Кіраўніцтва выбарамі ў раёнах ускласці на прэзідыумы адпаведных РВК.

7. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем акруговых з'ездаў советаў ускласці на Цэнтральную выбарчую камісію прэзідыума ЦВК БССР (старшыня тав. Ляўкоў).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

ГРУБАЕ ПАРУШЭННЕ УНУТРЫПАРТЫЙНАЙ ДЭМАКРАТЫІ

(АД БЕЛАРУСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ПРАВДЫ»)

Звычайна гэта адбываецца так: прапрацуе які-небудзь сакратар парткома мясяцы тры-чатыры і нечакана выклікаюць яго ў гарком, даручаюць другую работу. Гутарка ў такіх выпадках кароткая:

— Каму здаць справы?—пытае сакратар.

— Здай каму-небудзь з членаў парткома.

Кіраўнік парткома перадае каму ўзумае ключы ад пісьмовага стала — і са «здачай справы» пакончана.

Куды пашоў сакратар, чаму? У арганізацыі гэтага ніхто не ведае. Адчуваюць у сваёй рабоце сакратар, вядома, не знайшоў патрэбным.

Што рабіць? Выбіраецца новы сакратар. Глядзіш, праз 3—4 мясяцы адбываецца жраз такая-ж гісторыя...

У студзені 1934 г., напярэдадні XVII з'езда партыі, праходзілі ў Менску выбары партыйных камітэтаў. У сталіцы Беларусі ёсць каля ста фабрычна-заводскіх камітэтаў. Але толькі ў адным — на фабрыцы «Кастрычнік» — яшчэ працуе выбраны тады сакратаром тав. Канопік. Ён адзіны з ста выпадкова ўцалеў у гэтай бясспрыкладнай чахардзе сакратароў.

У той-жа час у дасятках арганізацый змянялася з 1934 года па 6—7 і больш сакратароў.

На заводзе «Беларусь» у студзені 1934 г. быў выбран сакратаром тав. Бабуляк. Ужо ў лютым яго паслалі вучыцца. «Справы» ён здаў тав. Ліўшыцу. Але ў сакавіку выяснілася, што Ліўшыц не справіўся з работай, і ён перадаў «справы» тав. Ходару. А яшчэ праз месяц сакратаром стаў Мядзелевіч.

Калі спатрэбілася даведацца на заводзе імя Молатава, колькі сакратароў парткома перабывала там за гэтыя-ж два гады, то ні адзін комуніст завода не змог успомніць усе прозвішчы. Спецыяльна прышлося сабраць партыйны актыў і наладзіць «вечар успамінаў». Калектыўнымі намаганнямі ўдалося ўстанавіць, што за два гады на заводзе было 6 сакратароў, прычым адны «праваралі» па 2—3 тыдні, а другія, «пастаянныя», — па 4—5 месяцаў.

Такая-ж карціна і ў партыйнай арганізацыі менскага мясакамбіната. У пачатку 1934 г. быў выбран тут Царфін — начальнік цэха. Працаваў 4 месяцы. Аслабанілі з-за перагружанасці. Гарком прысłаў Марголіна. Яго ніхто не выбіраў. Праз 5 месяцаў ён пашоў невядома куды. Неўзабаве прышоў Маслянскі. Ці быў ён выбран, колькі працаваў, куды пашоў — устанавіць зараз немагчыма. Вядома толькі адно: Маслянскі выклікаў члена парткома тав. Сурбо, перадаў яму ключы ад пакоя і адбыў на новую работу, ні з кім не развітаўшыся. Затым кіравалі арганізацыяй «пачарзе, у залежнасці ад вольнага часу», тт. Сурбо і Сіўко. Ніхто з іх не быў выбран сакратаром. Так прадаўжалася 4 месяцы. У чэрвені 1935 г. выбралі тав. Бароўскага, а месяц назад гарком паслаў яго на вучобу, і зараз сакратарствуе Макарэвіч...

Частая змена сакратароў у партыйнай арганізацыі мясакамбіната прыяла да таго, што партком не мае цвёрдай лініі і мірыцца з яўна няправільнымі дзеяннямі антыпартыйных элементаў, выключаных з партыі пры праверцы.

Не дзіўна, што такія ганебныя адносіны да вырошчвання партыйных кадраў і прамое парушэнне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі пры водзяць да таго, што партыйная работа ў Менску не блішчыць зместам, хоць у дакладнасці захоўваецца форма: практыкуюцца самаправаздачы комуністаў, праводзяцца сходы... Партыйная работа залушчана, дысцыпліна паслабла. Там, дзе працуюць «часовыя» сакратары,—яны не ўпэўнены і нявопытныя і нават не чакаюць дапамогі, а знаходзяцца толькі ў чаканні чарговага «перакідвання»...

Наўрад ці трэба даказваць, што гэта бясспрыкладная цяжучасць кіруючых работнікаў пярвічных арганізацый нічога агульнага не мае з статутам і рашэннямі партыі.

Выбарнасць партыйнага кіраўніцтва ў Менску па сутнасці зведзена на-ніштo. Гэта прыводзіць да безадказнасці, грубейшых скажэнняў унутрыпартыйнай дэмакратыі, губіць ініцыятыву, адпітурхоўвае людзей ад кіруючай партыйнай работы.

Ф. ВІГДАРОВІЧ.
(«Правда»).

Берагчы партыйны дакумент, як зяніцу вока

Намеснік сакратара партыйнага камітэта фабрыкі «Сняг індустрыялізацыі» т. Міхайлоўская просіць кандыдата партыі т. Клавіра паказаць сваю кандыдацкую картку.

— У даную мінуту ў мяне яе пры сабе няма, — цвёрдым, упэўненым голасам адказвае т. Клавір. — Кандыдацкая картка ў мяне захоўваецца дома, у шафе. Ідучы на работу, каб не згубіць, я заўсёды, як і сёння, пакідаю сваю кандыдацкую картку дома. Вяру яе з сабой толькі ў тым выпадку, калі трэба зрабіць адзнаку аб членскім узносе.

Аднак, праз некаторы час тав. Клавір выпадкова заглянуў у свой бумажнік, у якім сярод іншых дакументаў, да яго вялікага здзіўлення, аказалася і кандыдацкая картка. Выяснілася, што тав. Клавір нядбайна адносіцца да захавання свайго партыйнага дакумента. Нават і тады, калі ён сапраўды пакідае сваю кандыдацкую картку дома, то захоўвае яе у адкрытай шафе, куды ўсякаму ёсць доступ.

Загадчык партыйнай фабрычнай школай, член партыі т. Шалыш таксама не мог упэўнена сказаць, дзе знаходзіцца яго партыйны білет. Шукаючы яго ў бумажніку, ён няўпэўненым голасам зварачаецца да т. Міхайлоўскай—мне здаецца, — гаворыць ён,— што пры ўплаце членскіх узносаў я яго пакінуў у парткоме. У сапраўднасці, партыйны білет аказаўся пры ім.

Злачынна нядбайна адносіцца да захавання свайго партыйнага дакумента кандыдат партыі тав. Каган. Сваю кандыдацкую картку яна трымае ў кішэні ў паліто, разам з іншымі дакументамі і рознымі паперамі. Вымаючы сваю кандыдацкую картку (дарэчы — вельмі пацёртую) для ўплаты членскіх узносаў, яна доўга шукала яе сярод кучы розных паперак.

Член партыі т. Шафранская захоўвае свой партыйны білет дома, у століку. Аднак, па яе асабістай заяве, яна, уходзячы на работу, вельмі неспакойна за захаванне свайго партыйнага дакумента, бо сваю кватэру яна пакідае на апеку маленькай пляменніцы.

Гэтыя прыклады ярка паказваюць, што некаторыя комуністы нядбайна адносяцца да захавання сваіх партыйных дакументаў.

Віцебскі гарком КП(б)Б павінен з гэтых фактаў зрабіць сур'ёзныя вывады.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Разгортванне совецкага гандлю з'яўляецца той актуальнейшай задачай, без вырашэння якой немагчыма далей рухацца наперад

І. СТАЛІН

Перабудова па-белкаапсаюзаўску

27 сакавіка старшыні акрспажыўсаюзаў і райспажыўсаюзаў былі ўзрадаваны такой тэлеграмай:

«Акрспажыўсаюзу і райспажыўсаюзу.

На працягу двух з паловай месяцаў вы арывалі план рэалізацыі цукру і махоркі і выкананне плана тавараабароту. Улічыце, што вы гэтым арываеце фінансавы план і бюджэт і ствараеце пагрозу псавання тавараў. Прапаную ў застаўшыяся дні (11) арганізаваць шырокі гандаль на кірмашах і базарах, развозкамі ў глыбінныя пункты забяспечыць безгаворачнае выкананне плана рэалізацыі цукру, махоркі і плана тавараабароту. Маю тэлеграму далажыць раённым арганізацыям. Стаўце пытанне аб дапамозе. Аб прынятых мерах тэлеграфуйце на маё імя. **Баскін».**

Пасля гэтай тэлеграмы ў Белкаапсаюзе лёгка ўздыхнулі. Цяпер адкрылася «новая эра» ў рабоце нізавых арганізацый спажывецкай кааперацыі.

Два з паловай месяцы па заяве тав. Баскіна ўсе падпарадкаваныя яму аб'яднанні зрывалі планы, а ён спакойна наглядаў за бяздзейнасцю кааперацыйнай сеткі, і цяпер рашыў тэлеграмай пакончыць з гэтым злом.

Нам невядома, калі, у якім відзе тэлеграфна ці поштай далажылі старшыні акруговых і раённых спажыўсаюзаў тав. Баскіну аб выкананні яго дырэктывы, але дакладна ўстаноўлена, што «новая эра» ў рабоце спажыўкааперацыі не наступіла.

Праходзячая справаздачна-перавыбарчая кампанія ў кааперацыі сваёй асноўнай задачай ставіла праверку выканання рашэнняў ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб перабудове работы спажывецкай кааперацыі.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ў Беларусі з усёй ясناсцю паказала, што Белкаапсаюз і яго сістэма зусім нездавальняюча правялі перабудову і не забяспечылі выканання асноўнай умовы перабудовы — арганізацыі бесперабойнага культурнага гандлю таварамі штодзённага попыту (соль, мыла, запалкі, цукар, табак, пасуда і т. д.).

Кіраўнікі Белкаапсаюза замест дзелавой большавіцкай работы па выкананню рашэнняў ЦК і СНК сталі на шлях парадной шуміхі і очкаўціральства. Жанглюючы агульнымі лічбамі выканання плана тавараабароту, яны работу нізавога звяна і гандаль таварамі шырокага спажывання прадаставілі самацёку.

За апошні час з апарата Белкаапсаюза, накшталт вышай прыведзенай тэлеграмы, сыплецца безліч пастаноў, цыркуляраў і распараджэнняў.

Адлегласць ад Менска да Дзяржынска невялікая. Вельмі добрая чыгуначная і аўтамабільная сувязь. Але чамусьці ніхто з адказных работнікаў Белкаапсаюза за 2 гады не сабраўся ўдастоіць сваёй увагай гэты важны буйны раён. Што-ж робіцца ў гэтым раёне, не шкодзіла-б ведаць кіраўнікам Белкаапсаюза.

24 красавіка праўленне дзяржынскага райспажыўсаюза адымае з работы і аддае пад суд старшыню путчынскага сельпо Хадыка за развал работы сельпо і незабеспячэнне ўсіх крам сельпо дастатковымі таварамі. А інструктару райспажыўсаюза Жывеню абвешчана суровая вымова з папярэджаннем за тое, што ён, будучы камандзіраваным у сельпо для аказання дапамогі, дазволіў дзён бяздзейнічаў.

На гэтым-жа пасяджэнні райспажыўсаюз паслаў для аказання дапамогі путчынскаму сельпо другога інструктара Пашкевіча, якому строга загадалі «знаходзіцца там да поўнага наладжання ўсёй работы, забяспечыць усе крамы сельпо неабходнымі дастатковымі таварамі». Інструктар зноў абследуе сельпо і яго крамы, зноў складае акты, у якіх з усёй дакладнасцю пералічвае, якіх іменна не хапае тавараў, і тут-жа ў актах дае такія парады:

«Адчыніць краму (аб завозе тавараў ён чамусьці прынцыпова не піша) раней і зачыняць пазней, іменна з 7 гадзін раніцы да 10 гадзін раніцы, пасля чаго зрабіць разноску тавараў у поле калгаснікам да абеда, у абедзены час зноў адчыніць краму і рабіць продаж тавару да 4 гадзін дня, потым зноў выйсці ў разноску ў поле да 6 гадзін вечара, а пасля зноў адчыніць краму».

Такія «разумныя» парады былі даны гэтым інструктарам 5 крамам сельпо.

Але ад гэтых парад тавараў не прыбыла. І адчыняюць краму прадаўцы, а там, як канстатуе інструктар, цукру няма, мукі няма, нітак няма, гаралі няма, запалак няма і чаго там толькі няма. Спіс тавараў, якія адсутнічаюць, складае 40 назваў.

Пры такіх умовах колькі ні адчыняй і ні зачыняй крамы, колькі ні ходзі ў поле, да калгаснікаў, усё роўна ад гэтага карысці ні на грош ні пайшчыкам, ні кааперацыі.

Не лепш і ў іншых сельпо.

Даволі сказаць, што ў райхарчмагу доўгі час не было солі, таксама як не было солі і ў цэнтральнай краме негарэльскага сельпо.

Між тым гэтымі таварамі Дзяржынскі раён, як і ўсе раёны Беларусі, поўнасцю забяспечаны.

Такія агіднасці робяцца літаральна пад носам у Белкаапсаюзе. Што-ж робіцца ў аддаленых раёнах і глыбінных пунктах, дзе тым больш не ступала нага белкаапсаюзаўскіх работнікаў?

У акруговым цэнтры ў Лепелі ў вінна-гастрэнамічным магазіне няма ў продажы рыбы, розных круп, гарчыцы, дрожджаў, варэння, гароднінных кансерваў і т. д. Больш таго, у лепельскай цэнтральнай сталовай няма цукру.

На базе Лепельскага акрспажыўсаюза ёсць лішкі ўсіх тавараў, якімі не гандлююць на мясцах, і ў якіх насельніцтва адчувае вялікую патрэбу (соль, махорка, запалкі, гаспадарчае і туалетнае мыла і т. д.).

Гэтыя тавары ляжаць мёртвым грузам і затаварванне акрспажыўсаюза па іх складае звыш 1 мільёна рублёў.

Яшчэ больш паражаючыя лічбы сведчаць аб агідных адносінах да прасоўвання тавараў.

План тавараабароту па Лепельскаму акрспажыўсаюзу па цукру выкананы на 46,7 проц., па солі — на 76,3 проц. і па махорцы — на 60 проц.

Больш таго, Белкаапсаюз зацвердзіў план 2 квартала па Лепельскаму акрспажыўсаюзу, выходзячы з паказальнікаў нявыкананага плана першага квартала. Такім чынам Белкаапсаюз стаў на шлях прамога патурання антыдзяржаўным тэндэнцыям. Аналагічная карціна і па Мазырскаму акрспажыўсаюзу.

Не гледзячы на велізарнае затаварванне, Белкаапсаюз прапягвае пасылаць у Мазыр і ў Лепель такія тавары, якіх шмат ляжыць на базах.

Базы, асабліва міжраённай спажывецкай кааперацыі, ператварыліся фактычна ў тармозячы цэнтр прасоўвання тавараў на вёску. І зараз палкам застаецца правільным для спажыўкааперацыі Беларусі выказванне таварыша Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б) аб тым, што

«У нас бывалі выпадкі, калі тавараў і прадуктаў было нямала, але яны не толькі не даходзілі да спажыўца, а прадаўжалі па гадах гуляць у бюракратычных захавулках так званай тавараправодзячай сеткі — у баку ад спажыўца».

Базы акрспажыўсаюзаў і многіх райспажыўсаюзаў з'яўляюцца ўвасабленнем хаосу і бесталкоўшчыны, панаючай у гандлёвым аддзеле Белкаапсаюза ў справе арганізацыі на мясцах сапраўднага культурнага гандлю.

Узорам бескультур'я, узорам таго, як не патрэбна гандляваць, могуць паслужыць многія сельскія і нават раённыя крамы.

У соўгасе Негаралае ў краме пернікі ляжаць разам з гузікамі. Ва многіх крамах прадаўцы адпускаюць спажыўцу нямытымі рукамі і газу, і крупы, і нават цукар. 40 проц. усіх крам па Мазырскай акрузе не адрамантаваны і знаходзяцца ў антысанітарным становішчы. У Дзяржынскім раёне большасць крам зусім не прыстасаваны для гандлёвых мэт.

Няма ніжай неабходнасці пералічаць яшчэ аналагічныя даныя аб рабоце сельпо і баз і аб кіраўніцтве Белкаапсаюза сваёй сеткай. Паданыя ў гэтым артыкуле факты і прыклады, характэрныя для большасці раёнаў БССР, дакладна праверены на месцы брыгадай Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК СССР, якая зараз абследуе работу спажыўкааперацыі БССР.

У выніку перавыбарчай кампаніі спажывецкай кааперацыі да кіраўніцтва прышлі новыя, лепшыя людзі, якія хочуць працаваць, хочуць змагацца за культурны гандаль на вёсцы. Яны адчуваюць патрэбу ў штодзённай дапамозе і кіраўніцтве. Ім трэба кіраваць. Але такая сістэма кіраўніцтва, якая зараз пануе ў Белкаапсаюзе, ні ў якой меры не забяспечвае падрыхтоўку арганізатараў кааперацыйнага гандлю, перашкаджае разгортванню тавараабароту паміж горадам і вёскай і тармозіць наладжанне бесперабойнага культурнага гандлю на вёсцы.

Аб некаторых пытаннях гандлю на вёсцы

У сакавіку мая бягучага года адбудзецца пленум Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК СССР.

Адным з пытанняў, якія будуць разгледжаны на пленуме, з'яўляецца пытанне аб правяцы выканання рашэнняў ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 25 верасня 1935 г. «Аб рабоце спажывецкай кааперацыі на вёсцы».

Асноўны сэнс гэтага рашэння заключаецца ў неабходнасці шырэй разгарнуць тавараабарот, бо «перамога калгаснага ладу на вёсцы, рост заможнасці і культурных попытаў калгасных мас высоўваюць новыя патрабаванні перад совецкім гандлем».

Велізарныя дасягненні прамысловасці, «безупыннае павелічэнне вытворчасці прамысловых тавараў шырокага спажывання дазваляюць усё паўней задавольваць растучы попыт калгаснай вёскі і ўжо цяпер значна палепшыць забеспячэнне сельскага насельніцтва прамысловымі таварамі».

Як выконваецца гэта ўказанне партыі і ўрада спажывецкай кааперацыяй Беларусі?

Праверка КСК павінна даць адказ на гэта пытанне.

Аднак, задачай праверкі з'яўляецца не простае фатаграфаванне практыкі гандлю на вёсцы. Кантроль павінен суправаджацца прынятнем мер на месцы для выпраўлення недахопаў, наладжвання работы спажыўкааперацыі. Зараз яшчэ рана гаварыць аб канчатковых вывадах нашай праверкі, але можна падвесці папярэднія вынікі на аснове абследвання лепельскага, мазырскага акрспажыўсаюзаў і дзяржынскага райспажыўсаюза па рашаючаму пытанню, — як гандлюе і снабжаецца сельская крама.

Таварыш Сталін на XVII з'ездзе партыі сказаў: «У нас бывалі выпадкі, калі тавараў і прадуктаў было не мала, але яны не толькі не даходзілі да спажыўца, а прадаўжалі па гадах гуляць у бюракратычных захавулках так званай тавараправодзячай сеткі—у баку ад спажыўца».

Патрэбна з усёй рэзкасцю адзначыць, што кааператары Беларусі да гэтага часу не выканалі гэтага ўказання таварыша Сталіна.

Што маем мы на вёсцы? Як правіла — затаварванне на базах і часта недахват нават востра-неабходных тавараў, напрыклад, цукру, солі, табаку, запалак, мыла і інш.

Возьмем Лепельскую акругу. Праверкай устаноўлены такія факты: Бярозкаўскае сельпо, Бягомльскага раёна, сістэматычна не забяспечвалася цукрам, мылам і іншымі таварамі ў студзені-лютым, у сакавіку-красавіку. Як запэўнівалі работнікі акрспажыўсаюза (старшыня тав. Вальтэр), справа снабжэння гэтага сельпо была наладжана, аднак, калі 23 красавіка я разам з тав. Вальтэрам прыехаў у Бярозкі, то мы ўстанавілі адсутнасць нават у галоўнай краме сельпо цукру-рафінада і запалак.

На жаль, гэтыя факты не адзінкавы — адсутнасць тавараў устаноўлена і ў радзе іншых крам. Так, пры праверцы ў сакавіку 109 крам у 10 не аказалася солі, у 7—мыла. У краме № 5 ушацкага сельпо не аказалася цукру, а ў галоўнай краме—цукерак, чаю, гаралачных вырабаў і т. д.

У самым гор. Лепелі ў раймагу не аказалася 106 тавараў з асартыменту для раймагаў.

Не лепш становішча і ў Дзяржынскім раёне. Цэлы рад крам не мелі многіх востра-неабходных дастатковых тавараў; так, у путчынскім сельпо не было солі, цукру-рафінада — у краме № 7, цукру-пяску — у крамах №№ 7, 3, 4, мукі жытняй, круп аўсяных і манных, паперы курыцельнай і цэлага раду іншых тавараў амаль ва ўсіх крамах.

Тая-ж карціна ў радзе крам Мазырскай акругі.

Ва многіх крамах няма нітак, іголак. У перыяд 10—18 красавіка кааператары ў радзе месц (Дзяржынск, Мсціж, Бягомльскага раёна, і інш.) у выніку бюракратычных спрачак з органамі Наркамунутгандля стварылі перабоі ў снабжэнні насельніцтва хлебам і мукой.

Асабліва абураючы такі факт. У крамах халопеніцкага райспажыўсаюза сельскія крамы цэлы месяц не мелі мукі для продажу толькі таму, што загадчык крупскім пунктам Заготзярна, маючы нарады, не хапеў даваць мукі, спасылаючыся на тое, што калісьці халопеніцкі райспажыўсаюз не здаў яму тары. Белкаапсаюз захаваў у гэтай справе ролю простага наглядальніка. Старшыня Белкаапсаюза Баскін не знайшоў часу нават пагаварыць з Наркомунутгандлем, тав. Гурэвічам па гэтаму пытанню.

Чым вытлумачыць такую злачынную работу некаторых кааператараў? Адной з важнейшых прычын з'яўляецца нікуды нягодная арганізацыя раённага аптовага звяна.

Базы раённых і акрспажыўсаюзаў з'яўляюцца галоўнай крыніцай снабжэння сельпо таварамі.

Што-ж уяўляюць сабой базы?

База дзяржынскага райспажыўсаюза — гэта пара сараяў, двор базы з'яўляецца фактычна балотам, у якім гразнуць машыны і коні, тавары знаходзяцца ў хаатычным беспарадку.

Не лепш, а, бадай, горш абстаіць справа ў Лепельскай акрузе —той-жа бруд, хаванне тавараў (жалезныя койкі, рыба, пасуда і інш.) пад адкрытым небам. Частка складаў была заліта вадой і зімой тавары ўмерзлі ў лёд.

Не лепш становішча і ў Мазырскай акрузе.

Работнікі акрспажыўсаюзаў і баз не сочаць, якія тавары заўпрае сельпо, якіх няма.

Ніякага аптовага гандлю па сутнасці справы няма, а ёсць размеркаванне, вярней, спісванне ў нізаную сетку сякіх-такіх тавараў.

Пры адсутнасці велізарнай колькасці тавараў у сельскіх крамах базы літаральна ламаюцца ад запасу цукру, солі, мыла гаспадарчага, табаку, запалак і інш. Дастаткова сказаць, што лепельскі акрспажыўсаюз мае звышнармальных запасаў мыла гаспадарчага на 121 тыс. руб., запалак—36 тыс. руб., шасцімесячную астачу макаронаў, велізарныя запасы цукру, солі, махоркі.

На менскай міжраённай базе запасы тавараў звыш нарматыву дасягнулі 1.200.000 руб.

Белкаапсаюз даведаўся пра гэтыя факты толькі ў рэзультаце нашай праверкі.

Тое-ж у Мазыры і ў Дзяржынску. Работнікі спажыўкааперацыі любяць спасылацца на недахват транспарту, як быццам найважнейшую прычыну адсутнасці тавараў у нізавой сетцы.

Гэта абсалютна няправільна. Няправільна таму, што транспарт самой кааперацыі выкарыстоўваецца вельмі дрэнна.

Даволі адзначыць, што ў Лепелі да апошняга часу шоферы не былі пераведзены на адзельную аплату працы. А самае галоўнае—кааператары і пальцам не паварушылі, каб дагаварыцца з калгасамі аб прадстаўленні перавозачных сродкаў на аснове двёрдых дагавораў. Між тым калгасы ахвотна ідуць у гэтай справе насустрач кааперацыі.

Нарэшце, мала насыціць сельскую сетку таварамі. Неабходна падвезці тавар да спажыўца, у тых выпадках, калі паселкі знаходзяцца далёка ад сельскай крамы (8—4—6 кілометраў). Гэта можна зрабіць шляхам арганізацыі развознага гандлю. Аднак, у абследваных раёнах і акругах справа развознага гандлю пастаўлена вельмі дрэнна. У лепшых выпадках практыкуюць развозны гандаль у бліжэйшыя ад буйных насельных пунктаў паселішчы. Гэта, аднак, не тое, чаго трэба патрабаваць ад развознага гандлю.

Развозны гандаль павінен у першую чаргу абслужыць найбольш аддаленыя насельныя пункты. Ён павінен павялічыць тавараабарот па прадметах першай неабходнасці.

Вышэй мы асвятлілі толькі некалькі пытанняў, ужо ўскрытых праверкай работы спажыўкааперацыі. Агульны вывад: спажыўкааперацыя абследаваных раёнаў і акруг дрэнна выконвае рашэнні ЦК ВКП(б) і СНК СССР, незадавальняюча снабжае вёску таварамі.

Прычынай гэтай дрэннай работы з'яўляецца выключная непаваротлівасць работнікаў кааперацыі.

На самой справе, дзяржынскі райспажыўсаюз будуе з 1932 г. базу, але па гэтага часу яе не пабудаваў. А між тым пабудаваць яе лёгка можна было. Некалькі месяцаў райспажыўсаюз дабіваўся ажазу Інтранса (Масква) на куплю блакгауза ў Негарэлым, зусім непатрэбнага Інтрансу. Толькі пасля ўмяшання КСК дагавор на куплю быў падпісан і праз месяц Дзяржынск будзе мець добрую базу.

Можна было зрабіць гэта раней. Але ніхто з Белкаапсаюза не ўказіўся гэтай справай.

Можна было лёгка расшырыць базу і ў Лепелі. Толькі пасля ўмяшання КСК былі прыняты меры,—куплен склад, які дазволіць убраць тавары са двара і навесці парадак у справе іх хавання.

У Лепелі і Дзяржынску разгортваецца работа па заключэнню дагавораў з калгасамі на падвозку тавараў.

Лепельскі акругком КП(б)Б пастанавіў закончыць гэту работу к 10 мая.

Сельская сетка тых сельпо, дзе знаходзяцца работнікі КСК, рэгулярна снабжаецца дастатковымі таварамі, перабоі хутка ліквідуюцца.

Чаму гэтага не рабілася раней і дзе быў Белкаапсаюз?

Сутнасць іменна ў гэтым. Белкаапсаюз не мае неабходнай жывой сувязі з мясцамі.

Вось адзін прыклад. Белкаапсаюз праводзіць у красавіку стахановскі месячнік. Выданы інструкцыі, цыркуляры.

Калі-ж кантралёры КСК на месцы — у сельпо — пыталі работнікаў прылаўка аб тым, як ідзе стахановскі месячнік, то некаторыя з іх нават не ведалі аб тым, што Белкаапсаюз абвясціў красавік стахановскім месяцам.

Работнікі Белкаапсаюза запэўняюць, што ў іх справа ідзе дакулярамі справа ідзе больш чым добра. Дастаткова адзначыць, што ўжо ў 1936 г. Белкаапсаюз выдаў 451 пастанову і распараджэнне старшыні Белкаапсаюза, апрача таго, аддаелы і кіраўніцтвы спусцілі на месца каля 700 цыркуляраў.

Час ужо Белкаапсаюзу паклапаціцца аб снабжэнні вёскі таварамі, а не цыркулярамі і пастановамі, якія мала хто чытае, і фактычна ніхто не правярае правядзення гэтых пастаноў у жыццё.

Н. А. ПЕТРУНІЧЭЎ,
Член Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК СССР.

АУТАМАШЫНА ВЯЗЕ 21 ТОНУ ЛЕСУ

Гэтымі днямі механік менскага аўтагаража Белпрамбудтрэста Грышановіч А. скончыў сканструяванне новага прычэпа для перавозкі грузаў да 5-тоннай аўтамашыны «ЯГ-46»; скарыстаў для гэтага старыя колы.

Са звычайнай рэйкі Грышановіч зрабіў рассовачнае дышла. Зняўшы кузаў з грузавой машыны, ён дарабіў драўляную, акаваную жалезам, рухаючуюся падушку. Такая-ж падушка ёсць і на сканструяваным прычэпе, які прымацоўваецца рэйкай да буфера машыны.

17 красавіка быў праведзен вопыт перавозкі лесаматэрыялаў на грузавой аўтамашыне-пяцітонцы з новасканструяваным прычэпам. Нагрузіўшы 21 кубаметр сплаўлесу, механік Грышановіч правёз гэты груз на 20 кілометраў. Машына ішла вельмі добра, матор не адчуваў ніякай перагрузкі. Да гэтага часу на грузавых 5-тонках з ленінградскім прычэпам вазілі ад 5 да 7 кубаметраў лесаматэрыялу

НА ЗДЫМКУ (злева) — грузавік «ЯГ-46» з 21 тонай лесу; справа—Антон Грышановіч.

Белсаюзфото. Фото С. Грына.

Парламенцкія выбары ва Францыі

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ КОМПАРТЫІ

ВЫСОКАЯ АКТЫЎНАСЦЬ ВЫБАРШЧЫКАЎ

ПАРЫЖ, 26 красавіка. (БЕЛТА). Сёнешнія выбары ў парламент прайшлі спакойна. Паводле ўсіх даных, удзел выбаршчыкаў вельмі значны.

У Парыжы з 8 гадзін раніцы выбаршчыкі нахлынулі да выбарчых пунктаў, якія ў большасці выпадкаў размешчаны ў комунальных школах. Доўгая чарга выбаршчыкаў цярпліва чакала пад дажджом моманту, калі яны будуць дапушчаны да урны.

Важнейшай тэмай размоў з'яўлялася пытанне аб пагрозе вайны і аб тым, як яе ўнікнуць. Жанчыны, якія ва Францыі пазбаўлены выбарчага права, праяўлялі вялікую цікавасць да выбараў. У адным з выбарчых участкаў (у рабочым квартале, у паўночна-ўсходняй частцы Парыжа) жоны рабочых сабраліся пры ўваходзе ў выбарчае бюро. Некаторыя выбаршчыкі звярнуліся да іх са словамі: «У наступны раз будзеце галасаваць разам з намі».

Фашысцкая арганізацыя «Баявыя крыжы» заявіла, што яе члены пойдуць на выбары «арганізаванымі» шляхам. Гэта значыць, што кожны член арганізацыі атрымаў ад рабіннага кіраўніка бюлетэнь з імем кандыдата, за якога ён павінен галасаваць. Ва ўстаноўленую гадзіну ўсе члены «баявых крыжоў» павінны былі з'явіцца на выбарчыя пункты і падаць свой голас за таго кандыдата, за якога ім прапанавана галасаваць.

Падача галасоў спынілася к 18 гадзінам, пасля чаго неадкладна пачаўся падлік.

КОМУНІСТЫЧНЫЯ КАНДЫДАТЫ НА ПЕРШЫХ МЕСЦАХ

ПАРЫЖ, 27 красавіка. (БЕЛТА). Далейшыя весткі аб рэзультатах першага туру выбараў ва французскі парламент, атрыманыя да 1 гадзіны 15 мін., па парыжскаму часу, паказваюць, што «прыкладна, каля ⅔ займаюць рэзультаты, якія патрабуюць перабалатыроўкі. Атрыманы весткі аб выбранні раду комуністычных дэпутатаў.

На першым месцы ідзе генеральны сакратар компартыі Марыс Тарэз, выбраны ў Івры сакрушальнай большасцю галасоў. Ён атрымаў 18.963 галасы, у той час як у 1932 годзе ён атрымаў у першым туры толькі 12.237 і быў выбран у другім туры 14.411 галасамі.

Комуніст Капрон выбран 11.423 галасамі, у той час як у 1932 годзе ён атрымаў у першым туры 6.983 галасы і быў выбран у другім туры 9.737 галасамі.

Андрэ Марці выбран у другім участку 13 округі Парыжа, дзе атрымаў 9.905 галасоў. У 1932 годзе комуніст Манжовіс, уступіўшы ў гэтым годзе сваё месца Марці, атрымаў у другім участку ў першым туры 5.422 галасы і быў выбран у другім туры 6.880 галасамі.

Апрача таго, выбраны Вайян Кутур'е і Сімон (комуністы) — у горадзе Мец. Згодна неправераных пакуль вестак, выбраны таксама комуністы Монмусо, Рамет і Дэвез.

З 39 выбарчых участкаў Парыжа канчатковыя рэзультаты ёсць толькі ў сямі. У астатніх мае быць перабалатыроўка.

У 6 з гэтых участкаў комуністы стаяць на першым месцы па ліку атрыманых галасоў, а ў 13 участках комуністы стаяць на другім месцы. Па дэпартаменту Сены пакуль што ёсць весткі аб 14 участках. У 6 з іх на першым месцы ідуць комуністы (двое з іх — Тарэз і Капрон—выбраны), у 7—комуністы па ліку галасоў знаходзяцца на другім месцы.

Сярод відных дзеячоў выбраны: міністр пошт і тэлеграфаў Мандэль, старшыня фінансавай камісіі палаты Мальві (радыкал-соцыяліст), міністр земляробства Дэлье, былы міністр Луі Рален (правы цэнтр), былы міністр авіяцыі П'ер Кот, соцыяліст Леон Блюм. Перабалатыроўка прадстаіць старшыні палаты Буісону, соцыялісту Леба (мэр горада Ліль), дэ-Монзі, комуністу Перы і іншым. Перы, выбраны ў 1932 годзе ў першым участку Верэля ў другім туры 12.222 галасамі, атрымаў на гэты раз у першым туры 15.033 галасоў.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

ПАРЫЖ, 27 красавіка. (БЕЛТА). К данаму моманту вядомы рэзультаты галасавання па 611 выбарчых округах з 618. У 432 округах мае быць перабалатыроўка.

У першым туры выбрана 179 дэпутатаў, якія размяркоўваюцца наступным чынам.

Правыя і правацэнтрысцкія групоўкі — 117 чал.

Левыя партыі і групоўкі, якія ўваходзяць у народны фронт—62 чал., у тым ліку радыкал-соцыялісты — 21, «незалежныя соцыялісты» — 3, «соцыялістычны саюз» — 5, соцыялісты — 23, шоністы — 2, комуністы — 8.

Выбраны ў першым туры наступныя кандыдаты комуністычнай партыі: Марыс Тарэз (атрымаў найбольшы лік галасоў у краіне), Андрэ Марці, Рэно Жан, Рамет, Манмусо, Вайян Кутур'е, Леві, Крыстафоль і Капрон.

У першых ацэнках выбараў адзначаюцца дзве характэрныя асаблівасці: 1) велізарны лік кандыдатур, падлягаючых перабалатыроўцы, які перавышае рэкордную лічбу 1928 года, і 2) вельмі значнае павелічэнне ліку галасоў, атрыманых комуністамі.

Згодна папярэдніх падлікаў «Юманітэ», комуністы атрымалі ў першым туры больш паўтара мільёна галасоў супроць 790 тыс. у 1932 г. Апрача таго, згодна падлікаў той-жа газеты, у комуністаў больш ці менш спрыяючыя шансы на выбранне ў другім туры ёсць у 60 округах. Яшчэ ў большым ліку округ склаўся ў той ці іншай меры спрыяючае становішча для іншых партый народнага фронта, у першую чаргу для радыкал-соцыялістаў. Агульных вестак аб процанце галасаваўшых па ўсёй краіне, а таксама аб ліку галасоў, атрыманых асобнымі партыямі, яшчэ няма.

*

ПАРЫЖ, 27 красавіка. (БЕЛТА). Каментуючы вынікі першага туру парламенцкіх выбараў, усе раніцнія газеты канстатуюць вялікі рост выбарчай актыўнасці мас, а таксама выключна вялікі лік округ, у якіх лёс выбараў будзе вырашацца ў другім туры выбараў 3-га мая.

Усе газеты прызнаюць поспех комуністаў на ўчарайшых выбарах. Правы друк з трывогай канстатуе перамогі компартыі, у той-жа час, аднак, прабуючы сябе ўцешыць тым, што гэтыя перамогі ў асноўным атрыманы нібыта за кошт іншых партый, якія ўваходзяць у народны антыфашысцкі фронт.

ПЕРАМОГІ НАРОДНАГА ФРОНТА У ІСПАНІІ

145 ДЭЛЕГАТАЎ НАРОДНАГА ФРОНТА

ПАРЫЖ, 27 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Іспаніі, апублікаваны афіцыяльныя даныя аб выбарах дэлегатаў, якія сумесна з дэпутатамі картэсаў (парламент) павінны будуць 10 мая выбраць новага прэзідэнта рэспублікі.

Згодна гэтых даных, выбрана 167 дэлегатаў, з іх 145 з'яўляюцца кандыдатамі народнага фронта.

Сярод выбраных кандыдатаў народнага фронта 16 комуністаў, 62 соцыялісты, 41 левы рэспубліканец і 26 членаў рэспубліканскага саюза.

У Астурыі ўсе 17 дэлегатаў, якіх выбрала гэта правінцыя, з'яўляюцца кандыдатамі народнага фронта; сярод іх 9 соцыялістаў, 3 комуністы, 5 левых рэспубліканцаў.

Польска-венгерскія перагаворы

ВЕНА, 26 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Будапешта, польскі прэм'ер Касцялкоўскі і суправаджаючыя яго асобы пакідаюць сёння венгерскую сталіцу. Касцялкоўскі меў шмат гутарак з прэм'ерам Гембешам, міністрам замежных спраў Канія і іншымі членамі венгерскага ўрада.

У апублікаваным паведамленні аб польска-венгерскіх перагаворах пацвярджаецца, што падпісана дадатковае пагадненне к гандлёваму дагавору паміж Польшчай і Венгрыяй, а таксама консульская канвенцыя.

У прыватнасці, у паведамленні гаворыцца:

«У рэзультаце абмену думкамі дзяржаўныя дзеячы абодвух краін з задаваленнем канстатавалі наяўнасць значнага зруху ў гаспадарчых, культурных адносінах абодвух краін. Яны ўстанавілі поўнае супадзенне поглядаў ва ўсіх абмяркоўваўшыхся пытаннях і прынялі рашэнне садзейнічаць далейшаму ўмацаванню польска-венгерскай дружбы. Дзяржаўныя дзеячы абодвух краін канстатавалі таксама, што супрацоўніцтва Польшчы і Венгрыі вельмі пажадана ў інтарэсах міру».

ДАЛЕЙШАЕ ЗВУЖЭННЕ МАСАВАЙ БАЗЫ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА

ШМАТЛІКІЯ АРЫШТЫ РАДАВЫХ НАЦЫЯНАЛ-СОЦЫЯЛІСТАЎ

ПРАГА, 24 красавіка. (БЕЛТА). Выдаваемая ў Празе газета «Дэйчэ рэволюцыон» (орган групы Ото Штрасера «Чорны фронт», якая адкалолася ў свой час ад гітлераўцаў) паведамляе, што ў Германіі праводзены масавыя арышты сярод нацыянал-соцыялістаў, галоўным чынам сярод членаў «працоўнага фронта» і ахоўных атрадаў. У адным толькі Берліне арыштавана 500—600 членаў фашысцкай партыі, сярод якіх шмат кіруючых асоб.

Паводле слоў газеты, ва ўсіх гэтых выпадках справа ідзе аб «радыкальных элементах», незадаволеных палітыкай міністра гаспадаркі Шахта і надзвычай высокімі прыбыткамі ваеннай прамысловасці.

Ва многіх нацыянал-соцыялісцкіх арганізацыях — указвае газета — члены іх патрабавалі, спасылаючыся на 12 пункт нацыянал-соцыялісцкай праграмы, перадачы прыбыткаў ваеннай прамысловасці дзяржаве або нават нацыяналізацыі гэтай прамысловасці.

ВАЙНА Ў АБІСІНІІ

РЫМ, 26 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Стэфані перадае афіцыяльную зводку маршала Бадольо аб становішчы на паўднёвым фронце ў Абісініі. Згодна зводкі, італьянскія войскі пад камандаваннем генерала Граціяні прадпрынялі наступальныя дзеянні супроць умацаванай лініі абісінцаў у раёне Саса-Бане. На левым флангу фронта італьянская матарызаваная калона ў поўдзень 23 красавіка заняла Дагамедо (за 80 клм. на захад ад Саса-Бане).

Паводле слоў зводкі, раніцою 24 красавіка значныя сілы абісінцаў, вышаўшыя з Дага-Бура, атакавалі італьянскія пазіцыі ў Дагамеда. У цэнтры фронта італьянская калона атакавала раніцой 24 красавіка ўмацаваныя пазіцыі абісінцаў у Хаманле (за 30 клм. на поўдзень ад Саса-Бане). Бой, які цягнуўся ўвесь дзень, быў адноўлен 25 красавіка італьянскімі войскамі, якія атакавалі абісінцаў у даліне р. Фафан. Хаманле занят італьянскімі войскамі. Зводка адзначае, што абісінскія атрады аказвалі ўпартае супраціўленне. Італьянская авіяцыя рабіла бамбардыроўку і разведку.

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ВЫМЫСЛЫ ЯПОНСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ

УЛАН-БАТОРСКІЯ КОЛЫ АБ КАРЫ СМЕРЦЮ ВЫШЭЙШЫХ ЧЫНОЎ МАНГОЛЬСКАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ ПАЎНОЧНАГА ХІНГАНА

УЛАН-БАТОР, 26 красавіка. (БЕЛТА). У аўтарытэтных улан-баторскіх колах адкідаюцца паступным чынам па поводу паведамлення штаба квантунскай арміі аб прычынах кары смерцю Лін Шэна і іншых вышэйшых чыноў мангольскай адміністрацыі правінцыі Паўночны Хінган:

«Паведамленне штаба квантунскай арміі, што арыштаваныя ў Хайлары і расстрэляныя па пастанове японскага ваеннага суда кіраўнікі адміністрацыі правінцыі Паўночны Хінган нібыта падтрымлівалі сувязь з Мангольскай Народнай Рэспублікай, у прыватнасці, з дэлегацыяй МНР у часе канферэнцыі на станцыі Манчжурыя летам мінулага года, само сабой разумеецца, пазбаўлена якой-бы там ні было падставы.

Гэта ілжывае паведамленне, якое мы павінны з абурэннем адхіліць, мае сваёй мэтаю прыкрыць сапраўдную прычыну арыштаў і лютай кары смерцю кіруючых мангольскіх дзеячоў у Манчжоу-Го.

Сапраўдная прычына гэтай зверскай расправы заключаецца ў тым, што ўсе слаі мангольскага насельніцтва ў Манчжоу-Го, уключаючы нават чыноў вышэйшай адміністрацыі, на якіх японцы прабавалі апірціся, адносяцца з нянавісцю да захватчыкаў і да ўстаноўленага імі ў Манчжоу-Го рэжыму насілля, свавольства і нацыянальнага паніжэння. Нават мангольскія князі аказаліся больш не ў сілах служыць з-пад палі захватчыкам. Таму апошнія так люта з імі расправіліся.

Гэту сапраўдную прычыну кары смерцю Лін Шэна і іншых японская ваеншчына імкнецца прыкрыць правакацыйнымі паведамленнямі аб сувязях Лін Шэна з Мангольскай Народнай Рэспублікай, не гледзячы на відавочнасць таго, што наша краіна, занятая сваімі ўнутранымі справамі і работай па ўздыму матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню аратскіх мас, не імкнецца да якіх бы там ні было заваяванняў за рубяжамі нашай краіны і таму не мае патрэбы ва ўстаноўленні для гэтай мэты ні тайных, ні яўных сувязей.

Паведамленне штаба квантунскай арміі ўскосна пацвярджае, што мангольскія народы сапраўды бачаць у асобе Мангольскай Народнай Рэспублікі краіну нацыянальнай свабоды і сапраўднай незалежнасці».

Вышэй тэмпы і якасць веснавой сяўбы!

Ход сяўбы яравых па БССР на 25 красавіка 1936 г.

РАЁНЫ	Усяго засеяна яравых (без шматгадовых траў)		У тым ліку (у процантах)	
	Засеяна ў гектарах	Проц. выканання	Зерновых	Ільну
1. Бабруйскі	22312	69,0	89,7	89,6
2. Капаткевіцкі	8228	55,2	60,3	95,1
3. Тураўскі	4084	54,7	72,7	58,5
4. Мазырскі	12415	48,3	61,6	77,6
5. Старобінскі	9812	47,7	75,0	89,6
6. Петрыкоўскі	7086	47,6	52,9	95,6
7. Ельскі	7682	47,6	49,3	91,4
8. Жыткавіцкі	4857	47,5	57,5	69,9
9. Гроскі	9420	47,2	79,3	59,0
10. Нараўлянскі	8341	45,4	52,4	86,0
11. Даманавіцкі	12050	43,9	63,6	87,4
12. Чырвонаслабодскі	8128	43,8	79,2	75,5
13. Уздзенскі	8759	42,1	65,1	48,3
14. Брагінскі	8021	42,0	72,3	45,1
15. Хойніцкі	9561	40,6	71,6	56,6
16. Лепельскі	12209	39,2	55,4	93,4
17. Слуцкі	12546	39,0	68,3	60,6
18. Парыцкі	10645	38,1	57,1	22,5
19. Ушацкі	12478	38,0	55,5	74,1
20. Лельчыцкі	5796	37,9	37,6	79,1
21. Камарынскі	4329	37,8	57,3	57,1
22. Рэчыцкі	12839	35,0	56,8	42,2
23. Капыльскі	11821	33,7	74,2	33,1
24. Кіраўскі	10866	33,8	62,2	23,1
25. Чашніцкі	9340	32,4	35,7	95,2
26. Лоеўскі	7017	31,2	44,9	46,2
27. Свяцілавіцкі	6025	30,3	49,8	57,4
28. Глускі	9279	29,4	50,8	14,0
29. Бягомльскі	5594	29,4	45,8	47,8
30. Любаньскі	6089	28,6	55,9	34,0
31. Пухавіцкі	5646	27,2	52,9	49,1
32. Журавіцкі	75,33	27,0	46,1	28,6
33. Менскі	12131	26,8	56,6	47,3
34. Старадарожскі	5075	25,8	42,0	14,9
35. Чэрвеньскі	7170	24,0	40,3	42,1
36. Ветрынскі	5441	23,6	38,3	38,1
37. Бярэзінскі	8325	23,5	39,0	29,2
38. Смілавіцкі	6477	23,1	45,8	49,3
39. Прапойскі	5768	22,3	37,6	36,4
40. Веткаўскі	4283	22,2	45,1	11,1
41. Смалявіцкі	7750	22,0	35,4	30,0
42. Заслаўскі	4802	21,5	33,3	35,0
43. Жлобінскі	8193	20,1	35,8	27,2
44. Рагачоўскі	8064	20,1	35,8	8,2
45. Церахаўскі	5829	20,1	34,6	27,2
46. Дубровенскі	7129	18,7	14,8	70,6
47. Барысаўскі	6060	18,6	33,1	8,8
48. Бешанковіцкі	7627	18,6	30,4	28,0
49. Сенненскі	6319	18,6	10,6	84,7
50. Клічаўскі	8929	17,5	34,0	15,6
51. Добрушскі	2460	17,1	31,7	2,1
52. Крупскі	3719	17,0	30,8	13,0
53. Будакашалеўскі	3706	16,9	32,0	16,6
54. Быхаўскі	6994	16,9	31,5	7,4
55. Аршанскі	9506	16,9	26,7	47,3
56. Чачэрскі	3215	16,5	31,0	18,1
57. Даяржынскі	5535	16,3	26,8	10,7
58. Кармянскі	4829	16,1	28,3	13,2
59. Чавускі	7258	15,9	24,8	18,6
60. Віцебскі	4837	15,5	33,3	9,4
61. Асіпавіцкі	3197	15,1	30,6	10,8
62. Полацкі	4022	15,1	29,5	16,3
63. Гомельскі	3025	14,3	27,8	7,2
64. Уваравіцкі	3745	14,2	29,2	2,0
65. Бялыніцкі	4503	13,8	22,2	31,0
66. Лагойскі	3424	13,4	21,4	36,7
67. Талачынскі	5261	13,2	9,9	74,1
68. Крычаўскі	2513	12,3	26,6	6,9
69. Асвейскі	1775	11,7	22,5	7,9
70. Магілеўскі	6683	11,6	21,7	12,5
71. Халопеніцкі	3079	11,6	18,4	21,4
72. Плешчаніцкі	2413	11,1	20,2	0,2
73. Чэрыкаўскі	2877	10,3	17,7	10,4
74. Клімавіцкі	4060	9,8	19,5	1,0
75. Дрысенскі	3354	9,6	18,3	8,9
76. Лёзанянскі	3805	8,7	8,2	26,2
77. Чырвонапольскі	2445	8,5	15,4	2,0
78. Мсціслаўскі	3904	8,5	13,6	12,3
79. Касцюковіцкі	3361	8,4	16,3	6,1
80. Шклоўскі	4064	7,8	3,4	32,3
81. Хоцімскі	1757	7,6	15,0	4,5
82. Дрыбінскі	2548	7,2	12,2	6,7
83. Сіроцінскі	2342	7,1	13,5	4,7
84. Расонскі	1944	7,1	12,5	6,3
85. Багушэўскі	1968	7,1	11,4	12,1
86. Суражскі	2235	7,1	11,4	11,8
87. Мехаўскі	2145	6,7	12,6	4,5
88. Гарадоцкі	1607	5,6	11,0	1,8
89. Горацкі	1807	4,5	8,1	4,1
90. Круглянскі	1224	4,3	5,6	13,7
Па БССР:	**548216**	**21,3**	**33,9**	**30,6**
Было на 20 красавіка 1936 года:	201396	7,8	18,5	8,3
Было на 25 красавіка 1935 года:	870881	34,3	44,8	56,0

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ НКЗБ.

ДЗЕСЯЦІКОРПУСНЫ ПЛУГ ДА ТРАКТАРА „ЧТЗ"



Механік па сельгасмашынах Смалявіцкай МТС ГРАКОВІЧ ВІКТАР ІВАНАВІЧ сканструяваў дзесяцікорпусны плуг да трактара «ЧТЗ». Трактарная майстэрня МТС ужо выпусціла два такія плугі, для якіх скарыстаны старыя лемяхі трактарных плугоў «ФП». Аправа плугоў драўляная.

Дзесяцікарпусны плуг Гракові ча даў высокую якасць работы. Трактарыст Высоўка за змену ўзараў ім 21 гектар пры норме 17,4 гектара. Глыбіня ворыва—18 сантыметраў. На полі зусім няма агрэхаў.

Дырэкцыя МТС прэміравала Граковіча 500 кілограмамі хлеба і 200 руб. грашыма. НА ЗДЫМКУ: плуг Граковіча; у авале — тав. Граковіч.

Фото КАПЛІНСКАГА.

ЛІСЬМЫ З СТАРАДАРОЖСКАГА РАЁНА

III. КЛУБЫ, ГАЗЕТЫ, КРАМЫ

У калгасе імя Скварцова і Майёрава, Языльскага сельсовета, калгасніцы Анна Зык, Наталья Салавей, Дар'я Груэд, Параска Груэд і Мар'я Груэд, пад кіраўніцтвам сваёй звеннявой Матроны Амельчані, абавязаліся ў гэтым годзе атрымаць на двух гектарах па 10 цэнтнераў ільновалакна з гектара.

У тым-жа калгасе працуе брыгада ўдзельніка ўсебеларускай нарады перадавікоў ураджайнасці Зміцера Шуха. Многа і добра працуе брыгада. Па праву ёю ганарацца ва ўсім раёне.

У пакоі пасяджэнняў Языльскага сельсовета вісіць чорная і чырвоная дошка. Крэйдай на ёй выведзена каля дзесятка прозвішчаў. Чакаем, што зараз на чырвонай дошцы мы ўбачым прозвішчы людзей, якія аддана змагаюцца за самы высокі ўраджай, пастаханаўску праводзяць сяўбу.

Але дошка гаворыць не аб гэтым. Тут напісаны (невядома калі) прозвішчы «ўдарнікаў і зрыўшчыкаў» фінплана.

Побач вісіць насценная газета. З'яўляецца надзея — мо' тут знайшлі адлюстраванне гэтыя лепшыя людзі калгаснай вёскі, іх справы на сяўбе, сама сяўба?

Надзеі не апраўдваюцца. Як «апошнія навіны» ў газеце паведамляецца аб нарадзе перадавікоў жывёлагадоўлі сельсовета, якая адбылася 19 лютага, і затым ідзе кароткае апісанне зместу пастановы ЦК КП(б)Б ад 9 лютага аб культурна-масавай рабоце ў вёсцы. Ні слова аб сяўбе, аб людзях, аб становішчы ў калгасах.

Мы прывялі прыклад з гэтым сельсоветам, бо такое становішча характэрна для большасці калгасаў раёна. Культурна-палітычнае абслугоўванне калгаснікаў у часе сяўбы пастаўлена дрэнна. Калі меркаваць па клубах і чырвоных кутках, па насценгазетах і лозунгах, то можа стварыцца ўражанне, што ніякай сяўбы яшчэ няма, што да вясны яшчэ далёка. Ніякай культурнай работы не праводзіцца ў закуранай бруднай хаце, якая завецца клубам калгаса «Большэвік». Такі-ж непрыглядны выгляд маюць і клубы іншых калгасаў раёна.

Ёсць спробы наладзіць выпуск насценных газет. У калгасе імя Фрунзе выходзіць досыць зубастая насценная газета. Тут многа карыкатур, многа сапраўднай крытыкі. Але калі паверыць газеце, у калгасе ўсе «абібокі», лодыры, шкоднікі. Няма ні аднаго добрага чалавека, ні аднаго стахановца.

На самой справе гэта далёка не так. Добрыя людзі ёсць у калгасе, але не ведаюць іх, не ўмеюць узняць гэтых людзей, павесці за імі астатніх. Не мог назваць ні аднаго стахановца старшыня калгаса «Большэвік» Рухлевіч, намеснік старшыні калгаса імя Фрунзе і іншыя.

Ды і рэдактароў насценных газет ніхто ў раёне не навучыў працаваць па-новаму, ніхто не кіруе імі.

Не лепш з абслугоўваннем калгаснікаў промтаварамі. Райсаюз у пачатку сяўбы вынес пастанову і распрацаваў план арганізацыі абслугоўвання пасеўных работ. Пастанову і план напісалі і на гэтым супакоіліся.

У гэты час у Крамазорскім сельсавеце крама амаль заўсёды зачынена, прадавец нічога не ведае аб пастанове і плане райсаюза, і ніхто ў брыгады яшчэ не выязджаў. Цяжка выцягнуць кааперацыйных работнікаў на поле!

Добрую ініцыятыву праявілі старадарожскія комсамольцы. Яны рашылі снарадзіць для абслугоўвання сяўбы агітаўтамабіль. Але справа разгортваецца так марудна, што за час сяўбы ўсе калгасы і брыгады ён абслужыць наўрад ці паспее.

Вывад адзін. Ход сяўбы апярэдзіў усе чаканні і разлікі. Людзі ў калгасах, на полі працуюць хутчэй і лепш, чым раённыя арганізацыі, якім пакуль што цяжка ўгнацца за ініцыятывай і справамі саміх калгаснікаў.

Л. ГЛЕЗЕР.

ПАУТАРАЮЦЬ ЛЕТАШНІЯ ПАМЫЛКІ

На Асінторфе пачалася здабыча торфу. З першых дзён у рабоце адчуваецца расхлябанасць, недысцыпліванасць, нераспарадчасць кіруючага персаналу.

Прыехаўшыя на завод тарфянікі яшчэ не знаёмы з правіламі вядзення кар'ера, сцілкі, устаноўкі машыны. Гэтых элементарных ведаў не далі рабочым да пачатку работы. Нават не распрацавана сярод рабочых інструкцыя па тэхніцы бязапаснасці.

Першыя дні сезона паказалі недапушчальную бестурботнасць кіраўнікоў завода аб культурна-бытавых умовах сезоннікаў. Большасць тарфянікаў не атрымалі коўдры, многім не выданы прасцыні. Ва многіх інтэрнатах першага ўчастка (у 3, 4, 7, 8, 9-м) не хапае тумбачак, няма табурэтак і лавак, сядзець прыходзіцца на ложках. У інтэрнатах 3-га пасёлка зусім мала электрычнага святла. У 2 і 8 інтэрнатах 3-га пасёлка не праведзена электрычнасць. Рабочыя брыгады Крыўко тры ночы сядзяць у цёмным памяшканні. У інтэрнатах 3 і 2 пасёлка няма гардзінніка, люстраў і фіранак для вокнаў. Каменданты лічаць гэта прадметамі раскошы. Як на тое, з прыездам тарфянікаў заводскі радыёвузел спыніў сваю работу, — перагарэлі лямпы. На куплю новых лямп дырэкцыя адмовілася адпусціць 300 рублёў.

Усё гэта сведчыць аб абурачай безадказнасці кіраўнікоў, аб паўтаранні леташніх ганебнасцей. Бяспланава і неабдумана праводзіцца размяшчанне рабочых па інтэрнатах. Людзей перакідваюць з аднаго інтэрната ў другі, з аднаго пасёлка на другі. 15 красавіка намеснік каменданта ўчастка № 1 Валоў усяліў 15 рабочых брыгады Крыўко ў інтэрнат № 8 (трэці пасёлак), а праз дзень перакінуў людзей на другі пасёлак, у інтэрнат № 4. На працягу двух дзён чатырох рабочых брыгады Калцюрова перасялілі ў тры інтэрнаты па розных пасёлках. Такіх фактаў мноства.

Каб зайсці ў інтэрнат, рабочаму прыходзіцца прабірацца праз кучы будаўнічых адкідаў, некалькі канаў, на якіх ляжаць прагніўшыя і зусім паламаныя тратуары.

Не гледзячы на наяўнасць дастатковай колькасці прадуктаў і глушчаў, якасць абедаў далёка не здавальняючая. Рабочыя брыгады Разумовіча скардзяцца на дрэннае харчаванне ў сталовай № 5. Дрэнна кормяць і ў сталовай № 7 і ў цэнтральным пасёлку.

Першыя дні сезона паказваюць, што кіраўнікі Асінторфа не ўлічылі цяжкіх урокаў мінулых год, а гэта можа прывесці да дрэнных вынікаў і ў гэтым годзе.

М. ЗІЛЬБЕРТ.

ЗАМЕТКІ КІНОГЛЯДАЧА

Няграматная блытаніна

Вы чыталі Віктара Гюго. Убачыўшы рэкламу аб дэманстраванні кінофільма «Адвержаныя» па раману гэтага выдатнага французскага пісьменніка, вы спяшаецеся ў кіно «Пролетарый». Вы хочаце аднавіць свае ўражанні аб прачытаным рамане.

У дапамогу вам адміністрацыя кінатэатра паклапацілася выдаць праграму-лібрэто. У час чакання сеанса вы пад грукат джаза чытаеце праграму і вдзіўляецеся: няўжо змест кінофільма настолькі адрозніваецца ад рамана? Вы прагледваеце кінокарціну і пераконваецеся, што праграма не сходзіцца ні з раманам, ні з фільмам. У гэтай непісьменнай неахайна складзенай «праграме» чытаем:

«Весперабойны (гэта замест «беспрацоўны») галодны Вальжан украў кавалак хлеба ў краме. Яго спаймалі і... асудзілі на 19 год катаргі». Хлусня! Жака Вальжана асудзілі на 5 год. А потым за неаднаразовыя спробы ўцячы з катаргі асудзілі яшчэ на 14 год.

Далей: «у горадзе ўспыхнуў пажар. Смелы і рашучы Вальжан выратаваў з агню дзяўчынку з маткай. Дзяўчынку звалі Кзветай»... А з рамана вы памятаеце і на экране бачыце зусім іншае. Вальжан выратаваў двух дзяўчынак — дачок жандарскага капітана. А з Каветай і яго маткай ён пазнаёміўся зусім пры іншых абставінах.

Можна было прывесці яшчэ шмат такіх скажэнняў, але і гэтых даволі.

Ёсць падставы сумнявацца, ці чытаў калі-небудзь аўтар праграмы Губаравіч Віктара Гюго.

Такія чыноўніцка-напляваўцельскія адносіны да глядача не навіна ў Белдзяржкіно. Праграмы і да другіх кінокарцін таксама неахайна напісаны, таксама пераблытаны. Работнікі Белдзяржкіно ніяк не могуць пазбавіцца свайго чыста камерцыйнага, дзяляцкага падыходу да глядача і пічкаюць яго рознай халтурай.

І. СОЛЬСКІ.

ВЫКАНАЛІ КРАСАВІЦКІ ПЛАН

* Датэрмінова на 101 проц. выканаў красавіцкую праграму завод «Гомсельмаш».

* Камбінат «Спартак» (Гомель) на 25 красавіка выканаў месячны план на 100,7 проц. К канцу месяца камбінат дасць звыш плана прадукцыі на 300 тыс. руб.

* Віцебская інструментальна-мэблевая фабрыка 25 красавіка месячны план выканала на 100,9 проц., даўшы прадукцыі на 118.800 руб. Красавіцкую праграму фабрыка гнутай мэблі выканала на 100,5 проц.

***

27 красавіка завод імя Молатава (Менск) датэрмінова выканаў месячны план на 100,13 проц. 4-месячны план выканан на 101 проц. Рабочы калектыў абавязаўся да 1-га мая выпусціць звыш плана прадукцыі на 60 тыс. рублёў.

ФРЫД.

ПОЕЗД ВАГОЙ У 2.000 ТОН

ГОМЕЛЬ, 27 красавіка. (БЕЛТА). 26 красавіка машыніст гомельскага дэпо Лазоўскі на паравозе «Ш» прывёў са Жлобіна ў Гомель поезд № 820 вагой у 2.000 тон, пры норме 1.200 тон. Ён вёў поезд з хуткасцю 32,8 клм. у гадзіну замест 24 клм. па заданню. Да Гомеля Лазоўскі меў нагону 30 мінут.

АЎТАПРАБЕГ МЕНСК—КІЕЎ—МЕНСК

Заўтра, у 6 г. раніцы, на першым кілометры магілеўскай шашы ў Менску будзе дан старт скорэснаму аўтапрабегу па маршруту Менск — Кіеў — Менск, які арганізуе аўтамотасекцыя ВСФК БССР. У аўтапрабегу прымуць удзел 5 аўтамашын з 10 вадзіцелямі (па 2 вадзіцелі на машыну). Сярод вадзіцеляў лепшыя стахановцы — шоферы Менска тт. Дроад, Станілевіч, Рудак, Давідсон, Паўлоўскі, Урланіс і іншыя. Да Кіева спаборніцтвы праводзяцца індывідуальныя, а назад у Менск — камандныя.

У гэты-ж час у Кіеве будзе дан старт аўтапрабегу па маршруту Кіеў — Менск — Кіеў, які арганізуе аўтамотасекцыя ВСФК УССР. Абодва прабегі праводзяцца на першынства рэспублік.

«ГРУБЫЯ ПАРУШЭННІ ЗАКОНАЎ АБ ПРАЦЫ»

Пад такім загалоўкам змешчана ўчора ў «Звяздзе» заметка аб парушэннях законаў аб працы на віцебскай фабрыцы імя Кагановіча.

Учора старшыня ЦСПСБ тав Кавальчук паслаў старшыні ЦП саюза ільняшчыкаў у Віцебску тэлеграму, у якой прапануецца неадкладна расследаваць гэту справу і прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

РАДЫЁ Ў ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ

1 мая, у 7 г. раніцы, прывітаннем працоўным БССР і выкананнем «Інтэрнацыянала» пачнуцца перадачы з радыёстанцыі імя СНК БССР.

У 10 г. раніцы будзе трансляваць першамайскі парад з Краснай плошчы ў Маскве. Потым уся рэспубліка пачуе, як праходзіць святкаванне ў пролетарскіх цэнтрах БССР — у Гомелі і Віцебску, у сталіцы брацкай УССР — Кіеве, парад войск у Менску. У 12 гадзін дня пачнецца трансляцыя першамайскай дэманстрацыі ў сталіцы БССР.

Да позняй ночы не змоўкне радыё. Канцэрты лёгкай музыкі, частушкі і маршы, спецыяльныя перадачы для дзяцей, выступленні па радыё тэатра БВА, паэтаў і артыстаў і, нарэшце — танцавальная музыка, пад якую будуць танцаваць на вуліцах і плошчах.

2 мая з 16 гадзін 40 мінут пачнецца трансляцыя канцэртаў з гарадоў БССР — Магілева, Бабруйска, Оршы, Гомеля, Слуцка, Мозыра, Барысава і Віцебска. З 18 да 23 гадзін будуць перадавацца канцэрты з Тфліса, Кіева, Масквы і іншых гарадоў Саюза.

У СЯМ'І КАЛГАСНІКА ПОЧАПНЯ

ПАРЫЧЫ, 27 красавіка. (Кар. «Звязды»). Сям'я калгасніка Хведара Почапня з калгаса «Чырвоная Дубрава» рыхтуецца да вялікага свята 1 мая. Асабліва старанна рыхтуюцца дзеці — Федзя, Вера і Сцёпа.

Почапень хацеў у свой час спраўляць «вялікдзень», але дзеці запратэставалі супроць такога намеру і бацькі адмовіліся святкаваць рэлігійнае свята.

У першамайскія дні Федзя будзе са сцэны калгаснага клуба дэкламаваць верш «Пісьмо Варашылаву», Вера — «Квітнее праца вольная», а чатырохгадовы Сцёпа раскажа верш «Мы рэбяты-окцябраты».

Уся сям'я спраўляе да свята новую вопратку; рыхтуецца багаты абед.

ГЕОРГІЙ ЧЭРНЫХ ВЫЕХАЎ НА ДАЛЕКІ УСХОД

25 красавіка з Масквы на Далёкі Усход выехаў новы пагранічнік Георгій Чэрных, які добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай арміі.

Тав. Чэрных прабыў у сталіцы поўмесяца. Ён прысутнічаў на X з'ездзе ВЛКСМ, пабываў у маўзалеі Леніна, у лепшых маскоўскіх тэатрах і музеях. 23 красавіка тав. Чэрных быў прынят начальнікам Галоўнага кіраўніцтва пагранічнай аховы НКУС камкорам тав. Фрыноўскім і карпусным камісарам тав. Рашаль.

Ад'язджаючы, Чэрных заявіў, што ён уносіць самыя светлыя ўспаміны аб чырвонай сталіцы. Ён хоча найхутчэй атрымаць баявую зброю і заняць сваё месца сярод байцоў-пагранічнікаў.

НА ПАВЕТРА, НА СТАДЫЁНЫ...

Наступілі цёплыя веснавыя дні. Фізкультурнікі рыхтуюцца пакінуць спартыўныя залы і выйсці на стадыёны.

Лепшыя спартсмены рэспублікі трэніруюцца на поўдні. На бегавых дарожках пяцігорскага стадыёна развучвае старт лепшы спрынтэр БССР тав. Казлоў. Удасканальвае свой бег на 100 метраў чэмпіёнка рэспублікі Ліда Жыўнеранка. Штодзенна робіць кросы Іваньковіч, які праславіўся ўдзелам у кросе на прыз газеты «Юманіте» ў Парыжы. На трэку Тфліса развіваюць хуткасць веласіпедысты Рапапорт, Галавач, Максімаў і малалая гоншчыца Андрасюк. На футбольных палях Одэсы развучваюць складаныя камбінацыі з мячом футбалісты Беларускай ваеннай акругі і менскага «Дынамо». У Одэсе зараз штурхае ядро жанчына — лейтэнант Фаня Кліменка, прыгае з шостам спартакавец Арлоўскі, мятае молат Гетманец.

З 1 мая пройдуць месячную вучобу на курсах трэнеры па лёгкай атлетыцы і футболу. У Менску 12 мая будзе разыграна веснавое першынства спартыўных ведамстваў па футболу. Адначасова адбудуцца шасейныя велагонкі з удзелам гоншчыкаў Ленінграда.

Тысячы фізкультурнікаў пабягуць па вуліцах гарадоў рэспублікі ў дзень правядзення кросу імя Шверніка. Лепшых баксёраў рэспублікі ўбачыць у сябе Гомель, у маі. Там будзе разыграна ўсебеларускае першынства па боксу. Жанчыны-гімнастыкі Менска, Віцебска, Гомеля і Вабруйска прадэманструюць у маі сваю спартыўную тэхніку на жаночых гімнастычных спаборніцтвах у Менску.

Баскетбалісты Менска сустрэнуцца ў чэрвені ў Ленінградзе з камандамі Масквы, Ленінграда, Харкава і Кіева. Менскія валейбалісты будуць дабівацца перамогі ў Маскве ў сустрэчах з камандамі Масквы, Ленінграда, Тфліса, Кіева і Ташкента.

У Гомелі на Сожы адбудзецца матч па водным поло. На трэку ў Менску адбудуцца велагонкі камад Менска, Ленінграда і Кіева.

У жніўні — усебеларуская жаночая спартакіяда па лёгкай атлетыцы, месяцам пазней — усебеларуская калгасна-соўгасная спартакіяда.

У гэтым годзе ВСФК БССР упершыню праводзіць спаборніцтвы па стральбе і фехтаванню (штых, рапіра, эспадрон). Будзе праведзен шахматна-шашачны турнір з удзелам майстроў СССР.

Вялікую работу праводзіць новая секцыя ВСФК БССР — аўтамотаспорту. У канцы красавіка ў Менску будзе дан адначасовы старт скорасному аўтапрабегу па маршруту Менск—Кіеў—Менск, а ў Кіеве — па маршруту Кіеў—Менск—Кіеў. У маі прадстаяць гонкі на адзін кілометр на хуткасць і на адну гадзіну на дальнасць. Вялікае развіццё набудзе матацыклетны спорт. У трэкавых і шасейных гонках прымуць удзел матацыклісты Масквы. У жніўні адбудзецца скарасны мотапрабег па маршруту Менск—Ленінград—Менск.

Рэкбісты Менска павінны ў гэтым годзе заняць адно з вядучых месц у СССР. Значна павысяць сваю тэхніку тэнісісты, гарадошнікі, плаўцы і грабцы. У гэтым годзе ўся табліца спартыўных рэкордаў рэспублікі павінна быць абноўлена.

І. ЦЫВЕС.

ПЕРАД ВЫПУСКНЫМІ ЭКЗАМЕНАМІ



У ваенна-марской школе імя Фрунзе пачалася падрыхтоўка да выпускных экзаменаў. НА ЗДЫМКУ: курсанты-выцятнікі, комсамольцы (злева направа) тт. С. П. Ліскін, І. І. Скляроў, М. В. Куценка і В. І. Ігнаценка вывучаюць у ваенна-марскім габінеце тыпы караблёў.

Фото СЕКО (Саюзфото).

КОРАТКА

(Ад карэспандэнтаў «Звязды», БЕЛТА і з раённых газет)

* Цэнтральная экскурсійная база для школьнікаў адкрываецца ў Менску на пляцу Волі, у доме № 17. З 15 чэрвеня па 15 жніўня база прапусціць 1.100 школьнікаў—экскурсантаў, якія прыедуць знаёміцца з сталіцай БССР.

* Два перасовачныя зубалячэбныя габінеты арганізаваў полацкі райздраў для абслугоўвання калгаснікаў у час веснавой сяўбы. У кожным габінеце будуць працаваць урач і сястра.

* 5.800 заяў аб прыёме на 170 месц паступіла на курсы шофераў пры барысаўскай школе леспрамгасвуча.

* Універсальная машына для загрузкі і выгрузкі конскага воласу без вязкі сканструявана цеплатэхнікам віцебскага шчаціна-шчотачнага камбіната імя Куйбышэва тав. Г. Гофманам. Машына дасць 50 тыс. руб. эканомі ў год.

* 4.262 паведамленні аб выйгрышах па 51 тыражу «Пазыкі трэцяга рашаючага» і па 14 тыражу «Чацвертага завяршаючага» разаслала па раёнах БССР бюро безаблігацыйнага кіравання пры кіраўніцтве ашчадкасамі БССР.

* Новы сельмаг адкрыўся ў м. Насовічы. Перахаўскага раёна.

* Вобедная майстэрня ў калгасе «Завет Ільіча», Барысаўскага раёна, абслугоўвае рад суседніх калгасаў. За апошнія чатыры месяцы калгас атрымаў ад сваіх падсобных прадпрыемстваў 29 тыс. руб. даходу.

ПРЫЕЗД ЗАМЕЖНЫХ ТУРЫСТАЎ

НЕГАРЭЛАЕ, 27 красавіка. (Кар. «Звязды»). Сёння праз Негарэлае праехалі ў Маскву на першамайскія святы 18 турыстаў з Вены (Аўстрыя) і 7 турыстаў з Галандыі. З ЗША ў Менск прыехала група турыстаў у колькасці 5 чалавек.

ГАНДЛЕВАЯ ХРОНІКА

* Да 1 мая менская база Галоўкансервазбыта адкрывае 4 ларкі па продажу кансерваў, лімонаў і апельсінаў. Ларкі адкрываюцца на пасажырскім вакзале, Юбілейным пляцу, на Ленінскай і Інтэрнацыянальнай вуліцах.

* Макароны і вермішэль, прыгатаваныя на яйках, атрымаў Менхарчгандаль. Цана на макароны 6 руб. 80 кап. за кілограм, а на вермішэль — 6 руб. 60 кап.

ВЯСНА

Разліў ракі Сож у гор. Гомелі. Від з парку.

Фото КАПЛІНСКАГА.

ГРОСМАЙСТАР ЛІЛІЕНТАЛЬ У МЕНСКУ

26 красавіка ў Цэнтральным шахматна-шашачным клубе ў Менску гросмайстар Андрэ Ліліенталь даў сеанс адначасовай игры ў шахматы на 20 дошках. Гросмайстар выйграў 8 партый, столькі-ж прайграў і 4 звёў у нічыю. У Ліліенталя выйгралі праф. Праскуракоў, шахматысты Шэвельман, Жыткевіч, Бабіёр, Ракавіцкі, Гарэлы, Нісневіч і піонер Алесін.

Сёння ў клубе металістаў гросмайстар дасць сеанс адначасовай игры шахматыстаў заводаў імя Варашылава, імя Кірава і «Большэвік».

ЗДАРЭННІ

* Гадальны прытон. Мазырскі крымінальны вышук раскрыў гадальны прытон на кватэры О. А. Савінай, якая яе мае пэўных заняткаў. Муж яе быў судзімы і высланы ў аддаленыя мясцовасці Саюза. На працягу 1934 года і да апошняга часу Савіна на картах прадказала людзям іх лёс. Для вярбоўкі ў прытон людзей і папулярызацыі яго сярод адсталых жанчын Савіна прыцягнула М. Куніцкую і М. Казакававу. Устаноўлена, што за апошні час прытон наведалі супрацоўніцы мазырскай ашчадкасы Ракіцкая і Машкоўская, настаўніца В.-Аўцюкоўскай школы В. Ласута і іншыя. Штомесячна ад гадання Савіна мела каля 400 рублёў прыбытку. Утрымальніца прытона і яе дапаможніцы прыцягваюцца да адказнасці.

* «Даплатныя пісьмы». За апошні час некаторыя жыхары Менска часта атрымлівалі даплатныя пісьмы. Іх разносіў пісьманосец менскай газетна-паштовай канторы Н. Л. Жораў. «Сакрэт» гэтых пісьмаў быў вельмі просты: Жораў зрабіў з гумы самадзельны даплатны штамп, які ставіў на месцы сарваных з пісем марак, атрымліваючы з адрасатаў у сваю карысць за кожнае пісьмо па 40 кап. Жораў знят з работы і прыцягваецца да адказнасці.

ТЫРАЖЫ ПАЗЫК У МАІ

10—11 мая ў Маскве на электракамбінаце імя Куйбышэва адбудзецца 52 тыраж пазыкі «Трэцяга, рашаючага года пяцігодкі».

У Варонежы 23—26 мая праводзіцца 22 тыраж пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» і «Трэцяй пазыкі індустрыялізацыі».

ПАВЕДАМЛЕННІ

29 красавіка 1936 года ў 10 гадзін раніцы ў Доме партактыва адбудуцца чарговыя заняткі пра-семінара па гісторыі партыі бегадчыкаў партгабінетаў і семінара кандыдацкіх школ.

Дом партактыва Менгаркома КП(б)Б.

29 красавіка г. г., у 7 г. вечара, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) адбудзецца ўрачысты вечар, прысвечаны 47-й гадавіне пролетарскага свята 1 мая, для стахановцаў і знатных людзей Кагановіцкага раёна.

З дакладам выступіць тав. Чарвякоў.

Кагановіцкі Горрайком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІК.

АРШАНСКІ МЯСАКАМБІНАТ

ДА СВЯТА 1 МАЯ

ВЫПРАЦОЎВАЕ ВЫСОКАЯКАСНЫЯ

каўбасныя вырабы

60 гатункаў.

Таксама працуе пякарня па выпечцы піражкоў, пончыкаў, пельменей.

Ёсць рознічныя магазіны ў Оршы і інш. гарадах

АРГАНІЗАВАНА ДАСТАЎКА ТАВАРАЎ — НА ДОМ. —

З заказамі зварачацца па тэл. 1-11.

ДА ВЕДАМА АРГАНІЗАЦЫЙ І АСОБНЫХ ПАКУПНІКОЎ.

Аршанскі хлебакамбінат

прымае папяраднія заказы

ДА СВЯТА 1 МАЯ

на хлебабулачныя і кандэцарскія вырабы.

Вялікі выбар розных гатункаў тартоў, піражных, венскай здобы, сушак розных, сухароў, баранкаў і іншых высокасортных вырабаў.

Тарты згатаўляюцца па жаданню арганізацый і асобных спажыўцоў з адпаведнымі надпісамі (імёны, «1 мая» і інш.).

Да 1 мая выпускаюцца

ДЗІЦЯЧЫЯ ПЕРШАМАЙСКІЯ ПАДАРУНКІ,

у спецыяльнай упакоўцы.

Своечасова забяспечце заказ да свята 1 мая.

ЗАКАЗЫ прымаюцца на хлебазаводзе № 1 — Падгорная, рог Совецкай

30 КРАСАВІКА, у 7 г. вечара, у памяшканні Беларускага дзяржаўнага тэатра адбудзецца

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

пленума Менскага гарадскога совета

рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў разам з партыйнымі, профсаюзнымі, комсамольскімі і грамадзкімі арганізацыямі і прадстаўнікамі вайсковых часцей, прысвечанае МІЖНАРОДНАМУ ДНЮ 1 МАЯ.

На пленум уваходзяць па сваіх мандатах члены і кандыдаты горсовета, члены ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК і СНК БССР, упаўнаважаныя Камісіі Партыйнага і Совецкага Кантроля, члены ГК КП(б)Б, члены бюро райкомаў КП(б)Б, члены бюро ГК і РК ЛКСМБ, члены прэзідыума ЦСПСБ і члены прэзідыума райвыканкома.

Астатнія праходзяць па спецыяльных білетах, якія можна атрымаць у горсовеце (пакой 49, III паверх).

ПРЭЗІДЫУМ МЕНГОРСОВЕТА.

Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-І

Сёння, 28 красавіка,

„ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ"

Памяшканне Польскага тэатра (Совецкая, 17, тэл. 25-153)

Гастролі тэатра Чырвонай арміі БВА

СЁННЯ, 28 красавіка, ДАЛЕКАЕ

„Чырвоная зорка" ПАРТЫЙНЫ БІЛЕТ

2-я заключная серыя

„Пролетарый" АДВЕРЖАНЫЯ

„Інтэрнацыянал" Варожыя сцежкі

Кіно „Спартак" МЯЧ І СЭРЦА

Скора адкрываецца

вялікі па складу звяроў і птушак Маскоўскі першы перасовачны дзяржаўны

ЗВЯРЫНЕЦ.

Звярынец прывёз звяроў і птушак фауны СССР і заграніцы.

Звярынец будзе змяшчацца па Садова-Набяржнай, каля бетоннага маста, супроць электрастанцыі.

Звярынец купляе выбракаваных коней для кармлення звяроў

Белканторы ОПТЭ

ПАТРЭБЕН

рахункавод-сакратар.

Зварачацца па адрасу: рог вул. Карла Маркса і Урыцкага, 11-16, Белкантора ОПТЭ.

Аршанская арцель інвалідаў „Комунар"

на 1936 г. значна пашырыла асартымент выпрацоўваемых вырабаў. Ёсць цэх індывідуальнага пашыву мужчынскіх, жаночых і дзіцячых касцюмаў з матэрыялу заказчыкаў.

Да вяснова-летняга сезона выпушчана розная прадукцыя.

По швэйнаму цэху: штаны для дарослых, школьнікаў і дашкольнікаў, фуражкі, верхнія і дзіцячыя рубашкі.



Шавецкі цэх выпускае высокаякасны дзіцячы абутак.

Ёсць і мэблевы цэх, які вырабляе розную мэблю.

У ВІЦЕБСКІХ магазінах ТАБАКГАНДЛЯ

да ПЕРШАМАЙСКАГА СВЯТА

атрыман вялікі выбар розных папярос і табачных вырабаў,

Ёсць МАШЫНКІ ДЛЯ НАБІЎКІ ПАПЯРОС, МУНШТУКІ

і іншая табгалантарэя.

ДА ВЯСНОВА-ЛЕТНЯГА СЕЗОНА

АРЦЕЛІ АРШАНСКАГА ШВЭЙТЭКСТЫЛЬПРОМСАЮЗА

выпускаюць спецыяльны асартымент летніх вырабаў — касцюмы, фуражкі, плашчы, трыкатажныя вырабы.

Адкрыты тры пункты па ІНДЫВІДУАЛЬНАМУ ПАШЫВУ з матэрыялаў арцелі.

Заказы прымаюцца ў наступных гарадах:

у Оршы — арцель «Чырвоны Кастрычнік»,

у Магілеве — арцель «Аб'яднанне»,

у Лепелі — арцель «Прагрэс».

Пры аршанскай і магілеўскай кравецкай і трыкатажнай арцелях

адкрыты рознічныя магазіны

з вялікім асартыментам вырабаў:

БЛУЗКІ і КАСЦЮМЫ шаўковыя, МАЙКІ, ФУТБОЛКІ, ПАНЧОШНА - НАСОЧНЫЯ вырабы, ЖАНОЧЫЯ ШЛЯПЫ, ФУРАЖКІ, БРУКІ і т. п.

Арцелі закупаюць у любой колькасці

ТКАНІНЫ бавоўняна папяровыя і шарсцяныя, ПРАЖУ бавоўняна-папяровую, ВІСКОЗУ, АДЫХОДЫ і БРАК ШВЭЙНЫХ і ТРЫКАТАЖНЫХ ФАБРЫК, ІЛЬНОПЕНЬКАВАЛАКНО.

Аршанскі Швэйпромсаюз.

Аршанскі мясакамбінат

АРГАНІЗАВАЎ НОВЫ ЦЭХ ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ

розных шчотак, малярных пензляў.

З заказамі зварачацца па тэлефону 4-95.

УСІМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ І УСТАНОВАМ г. МЕНСКА.

30 красавіка, у 12 г. дня, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) адбудзецца

ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ

ўсіх гурткоў самадзейнасці,

якія выступаюць 30 красавіка на ўрачыстым пленуме горсовета і 2 мая на алімпіядзе.

Гурткі клуба будаўнікоў, фабрыкі імя Кагановіча, завода імя Варашылава, еўпедтэхнікума, друкарні імя Сталіна, Белвазпромсовета, фабрыкі «Кастрычнік», завода імя Кірава, Белпедтэхнікума і інш. павінны своечасова і поўнасцю з'явіцца.

Адказнасць за яўку нясуць кіраўнікі і фабзаўмясцкомы прадпрыемстваў і ўстаноў.

ПЕРШАМАЙСКАЯ КАМІСІЯ.

ГОМЕЛЬСКІ ТЛУШЧАКАМБІНАТ імя ГАЛАДЗЕДА

прыступае да выпрацоўкі МАЁНЕЗЫ —

гародзінай,

мясной,

сталовай

і іншых гатункаў.

Просьба да ўсіх гандлюючых арганізацый, сталовых і рэстаранаў даваць

ЗАКАЗЫ

па адрасу:

гор. Гомель, Нова Беліца, канторы „Саюзмаргзбыта".

Спосаб ужывання маёнезаў

Маёнезы ўжываюцца як прыправа пераважна да халодных блюд, вінегрэтаў і салатаў. Вінегрэт прыгатоўлены з гародніны, а таксама з гародніны з накрошанай рыбай, мясам або дзічыну паліваецца маёнезам і старанна перамешваецца лыжкай.

Адной 250-грамавай банкі дастаткова для двух кілограмаў вінегрэта або салаты. Вага—250 грамаў нето.

Кантора „САЮЗМАРГЗБЫТ".

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 68. Уп. Галоўлітбела № Г—4743.